Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага і харэаграфічнага мастацтва
Кафедра народна-песеннай творчасці і фальклору

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_________Л.Л.Ражкова
______________________

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

__________І.М.Грамовіч
_______________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# УВОДЗІНЫ Ў БЕЛАРУСКУЮ СПЕЎНУЮ ЭТНАФОНІЮ

*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Складальнік: *Э.В. Шчадрына,* магістр мастацтваў, старшы выкладчык

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.06.2022 г.
пратакол № 12

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Э.В. Шчадрына,* магістр мастацтваў, старшы выкладчык установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*Н.В.Петухова,* загадчык кафедры рэжысуры БДУКМ,

кандыдат педагагічных навук.

*А.У.Белы,* загадчык філіяла "Мачулішчанскі ЦКіВЧ",

магістр мастацтвазнаўства.

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай народна-песеннай творчасці і фальклору Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № 10 ад 24 мая 2022 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол №___ ад ______20___г.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю:
Адказны за выпуск:

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………….…….....4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ..……………..………………………………….7
2.1 Канспекты (тэксты лекцый)…………..……………………………………7
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ….....…………………………………………….54
3.1 Вучэбныя выданні, афіцыныйна рэкамендаваныя МА РБ ……………….54
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……...……………………….....................55
4.1 Пытанні да семінарскіх і практычных заняткаў…………………………..55
4.2 Заданні для кантролю самастойнай работы……………………………….61
4.3 Пытанні да заліку……………………………………………………………62
4.4 Пытанні да экзамену………………………………………………………..64
4.5 Пытанні да выніковай атэстацыі……………………………….............66
4.6 Тэматыка рэфератаў, курсавых і дыпломных работ……………………....67
4.7 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў…………………68
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………….....71
5.1Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне, вучэбная праграма УВА па вучэбнай дысцыпліне……………………………………………………….....71
5.2 Рабочы тэматычны план па дысцыпліне..…………………….............72
5.3 Методыкі выкладання дысцыпліны……..……………………….............74
5.4 Метадычныя рэкамендацыі…………………………………………………79
5.5Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны…………………………………………......................81
5.6 Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы...…………………..……………84

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» належыць да блоку агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў па фальклоры, і, у першую чаргу, прызначана для павышэння ўзроўню прафесійнай адукацыі студэнтаў-фальклярыстаў і паглыбленага вывучэння імі беларускай спеўнай традыцыі.

ВМК па вучэбнай дысцыпліне «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» мае інтэграцыйны характар. Для яе засваення студэнты выкарыстоўваюць веды, уменні і навыкі, набытыя падчас вывучэння смежных дысцыплін: «Фальклорны практыкум», «Культурная антрапалогія», «Этнаграфія», «Этнапедагогіка», «Этнасеміётыка» і інш., што забяспечвае іх комплекснае ўзаемадзеянне ў мэтах фарміравання ў студэнтаў сістэмнага ўяўлення аб будучай прафесійнай дзейнасці.

Дэфініцыя «этнафонія»[1] (грэч. εσυοs – народ, φωυή – гук) прапанавана ўкраінскім этнамузыколагам К.В.Квіткам для вызначэння спецыфікі тэмбравых асаблівасцей гуку, манеры выканання і асаблівасцей фразіроўкі ў народных спевах. Яе шырока ўжываюць ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы. У прыватнасці, дэфініцыю «этнафонія» выкарыстоўвалі ў сваіх публікацыях К. Квітка, І. Мацієўскі, А. Скарабагатчанка.

**Мэта** ВМК– пазнаёміць будучых кіраўнікоў і артыстаў фальклорных ансамбляў з асаблівасцямі стыляў і манер выканання і інтанавання народных песень, якія характэрныя для розных рэгіёнаў Беларусі.

**Кампетэнцыі:** валодаць навыкамі рэвітальзацыі каляндарных і сямейных абрадавых свят, пазаабрадавых побытавых практык і іх мастацкай рэканструкцыі на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

**Задачы:**

– засвоіць паняційны апарат этнафоназнаўства;

[1] Правапіс слова дадзены ў адпаведнасці э афіцыйна прынятым у беларускай навуковай літаратуры стандартам: Хай, М.К. Этнофоння, этнафонія, етнофонія, М.К. Хай // Восточнославянскмй фолыслор: словарь научной н народной термннологнн / Редкол.: К.П.Кабашнкков (отв. ред.) н др. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 464.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тэарэтычна асэнсаваць дыдактычныя прыёмы захавання этнафоніі беларускіх песень;

– асэнсаваць абраную аўтэнтычную манеру выканання;

– знаёміць з ёй, навучаць ёй іншых.

Азнаямленне з аўтэнтычнай манерай спеваў звязана з распрацоўкамі прадстаўнікоў беларусазнаўства, беларускай этнамузыкалогіі і аўдыёвізуальнай антрапалогіі. Таму пры выкладанні шырока выкарыстоўваецца разнастайны культуралагічны матэрыял (тэарэтыка-практычныя напрацоўкі культурнай антрапалогіі, тэорыі камунікацыі, фільмы і аўдыёзапісы этнолагаў і фалькларыстаў).

У выніку азнаямлення з курсам у поўным аб'ёме, згодна яго тэарэтыка-практычнай накіраванасці, студэнты будуць **ведаць**:

– змест асноўных дакументаў, што складаюць прававую базу дзейнасці спецыяліста па этнакультурным выхаванні, этнічных спевах (рэкамендацыі ЮНЕСКА, дзяржаўныя праграмы Савета Міністраў, пастановы Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры, якія тычацца традыцыйнай культуры і фальклору, мастацкай адукацыі);

– змест асноўныгх паняццяў, якімі кіраўнікам фальклорных ансамбляў давядзецца аперыраваць у будучай прафесійнай дзейнасці;

– дакладнае размежаванне тыпалагічных асаблівасцей стылю і манеры выканання народных песень згодна этнаграфічнай карце Беларусі (напрыклад, падводка – Усходняе Палессе; пералівы – Падняпроўе; бурдон – Заходняе Палессе; паглыбленасць гучання – Палессе, больш блізкая манера – Падзвінне і г.д.).

Адначасова з набыццём ведаў у галіне этнафоназнаўства, студэнт павінен **ўмець**:

– аналізаваць аўдыёзапіс народных выканаўцаў на прадмет этнафанічнай расшыфроўкі – мадэлявання з дапамогай фанетыкі тэкставага падрадковага перакладу і нотных знакаў дакладнага фарміравання гуказдабывання і інтанавання гіесні, якія характэрныя спевакам-носьбітам традыцыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праспяваць у ансамблі чатыры песні і дзве сольна, якія вызначаюць этнафанічныя (па стылі і манеры выканання) рэгіянальныя асаблівасці бытавання спеўных фальклорных жанраў розных рэгіёнаў Беларусі;

– выканаць адну з чатырох ансамблевых песень са спецыфічнай побытавай пластыкай, асаблівасці якой яскрава аддюстроўваюць уласцівасці народнага мастацтва (як цэласнай, сінкрэтычнай з'явы).

У працэсе заняткаў у студэнтаў фарміруюцца свядомыя навыкі:

– народнай вакальнай мелізматыкі – вакальныя фаршлагі, «гуканні», «скідванні»;

– спеваў з так званым «эфектам кампенсацыі», што абумоўлівае адчуванне рытмічнай свабоды, якая асабліва характэрная для абрадавага меласу;

– дакладнага фарміравання унісону на апошнім *fermata* прымарнага тону ў канцы куплета народных (перш за ўсё абрадавых) песень.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» прадугледжана ўсяго 90 гадзін, з якіх 50 – аўдыторныя (лекцыі – 36, семінарскія – 14).

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

## 2.1 Канспекты (тэксты лекцый)[2]

## УВОДЗІНЫ

Пытанні:

1. Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны.
2. Месца спеўнай этнафоніі ў фарміраванні этнічнай культуры.
3. Сувязь этнафоназнаўства з іншымі адгалінаваннямі этнаграфіі і практычнай фальклварыстыкі.
4. Асноўныя паняцці: народнасць, этнас, гук, народная культура, этнічная музыка.

Літаратура па тэме:

1. Говард, Майкл. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард / Пер. с англ. І.Карпікавай, М.Раманоўскага, А.Шыманскага; Пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія; Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.
2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.
3. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.
4. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.
5. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь; 1996. – 208 с.: іл.

Дэфініцыя «этнафонія»[3] (грэч. εσυos – народ, φωυή – гук) прапанавана ўкраінскім этнамузыколагам К.В.Квіткам для вызначэння спецыфікі

[2] У дадзеным вучэбна-метадычным комплексе прапануецца аўтарскі тэкст лекцый В.В.Калацэя.
[3] Правапіс слова дадзены ў адпаведнасці э афіцыйна прынятым у беларускай навуковай літаратуры стандартам: Хай, М.К. Этнофоння, этнафонія, етнофонія, М.К. Хай // Восточнославянскмй фолыслор: словарь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэмбравых асаблівасцей гуку, манеры выканання і асаблівасцей фразіроўкі ў народных спевах. Яе шырока ўжываюць ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы. У прыватнасці, дэфініцыю «этнафонія» выкарыстоўвалі ў сваіх публікацыях К.Квітка, І.Маціеўскі, А.Скарабагатчанка.

**Мэта** дысцыпліны – пазнаёміць будучых кіраўнікоў і артыстаў фальклорных ансамбляў з асаблівасцямі стыляў і манер выканання і інтанавання народных песень, якія характэрныя для розных рэгіёнаў Беларусі.

**Задачы:**

– засвоіць паняційны апарат этнафоназнаўства;

– тэарэтычна асэнсаваць дыдактычныя прыёмы захавання этнафоніі беларускіх песень;

– асэнсаваць абраную аўтэнтычную манеру выканання;

– знаёміць з ёй, навучаць ёй іншых.

Азнаямленне з аўтэнтычнай манерай спеваў звязана з распрацоўкамі прадстаўнікоў беларусазнаўства, беларускай этнамузыкалогіі і аўдыёвізуальнай антрапалогіі. Таму пры выкладанні шырока выкарыстоўваецца разнастайны культуралагічны матэрыял (тэарэтыка-практычныя напрацоўкі культурнай антрапалогіі, тэорыі камунікацыі, фільмы і аўдыёзапісы этнолагаў і фалькларыстаў).

Дысцыпліна «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» мае інтэграцыйны характар. Для яе засваення трэба выкарыстоўваць веды, уменні і навыкі, набытыя падчас вывучэння смежных дысцыплін: «Фальклорны практыкум», «Культурная антрапалогія», «Этнаграфія», «Этнапедагогіка», «Этнасеміётыка» і інш., што забяспечвае іх комплекснае ўзаемадзеянне.

**Народнасць** — моўная, тэрытарыяльная, эканамічная і культурная супольнасць людзей пераважна рабаўладальніцкай і феадальнай эпох. Найбольш старажытныя народнасці — егіпецкая, старажытна-грэчаская,

---

научной н народной термнпологнн / Редкол.: К.П.Кабашнккові (отв. ред.) н др. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 464.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кітайская і інш. У Заходняй Еўропе народнасці пачалі інтэнсіўна фарміравацца пасля распаду Франкскай дзяржавы з сярэдзіны 9 ст. Ва Усходняй Еўропе ў 9 — пачатку 12 ст. ў рамках Кіеўскай Русі склалася старажытна-руская народнасць. Агульнай назвай насельніцтва Кіеўскай Русі сталі этнонімы «русіны», «русічы». Усходне-славянскія плямёны — крывічы, дрыгавічы і радзімічы — засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі ў 6 — 8 ст., з 9 ст. племянная арганізацыя ўсходніх славян замянялася на тэрытарыяльна-княжацкую; на тэрыторыі Беларусі было больш за 10 княстваў, якія ў 9 — пачатку 12 ст. знаходзіліся ў складзе Кіеўскай Русі. Пасля яе распаду землі Наваградскага, Полацкага, Тураўскага і іншых княстваў увайшлі ў Вялікае Княства Літоўскае, у якім узмацняліся інтэграцыйныя працэсы, адбывалася далейшае развіццё феадальных адносін і стварыліся спрыяльныя ўмовы для кансалідацыі беларусаў у самастойны этнас.

Панаванне ў ВКЛ адзінай старажытна-беларускай мовы і культуры, развіццё гаспадарча-эканамічных адносін садзейнічалі фарміраванню беларускай народнасці. Гэты працэс пачаўся ў канцы XIII — XIV ст. і завяршыўся ў XV — XVI ст. Унутрыэтнічнай кансалідацыі беларускай народнасці садзейнічалі захаванне пэўнай самастойнасці ў рамках ВКЛ былых Полацкага, Віцебскага, Тураўскага, Слуцкага, Мсціслаўскага і іншых княстваў, а таксама рост гарадоў, развіццё гандлю, промыслаў і рамёстваў, кадыфікацыя і уніфікацыя дзяржаўна-юрыдычных норм. Наступныя XVII — XVIII ст. былі неспрыяльнымі для далейшага развіцця беларускай народнасці ў выніку працэсаў акаталічвання і паланізацыі, якая працягвалася амаль да сярэдзіны 19 ст. У 2-й палове XIX ст. ў працэсе развіцця капіталістычных адносін беларуская народнасць стала ператварацца ў нацыю. У выніку далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі паланізацыя беларусаў была заменена ўплывам рускай культуры, а сам факт аб'яднання ўсходніх славян (рускіх, беларусаў, украінцаў) у адзінай дзяржаве быў прагрэсіўнай з'явай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя этнічныя групы людзей свету і сёння маюць статус народнасці і не кансалідаваліся ў нацыі. Гэта шматлікія групы насельніцтва Афрыкі і некаторых раёнаў Азіі, якія былі калоніямі заходне-еўрапейскіх дзяржаў, а таксама невялікія народы, што не маюць выразнай нацыянальнай і этнанацыянальнай структуры (эвенкі, чукчы, ханты, мансі і інш.).

**Этнас** — сукупнасць людзей, якая сфарміравалася на пэўнай тэрыторыі, мае асаблівасці біялагічнага (знешні выгляд), сацыяльнага (сямейна-бытавыя, абшчынныя і іншыя адносіны паміж людзьмі), культурнага (мова, духоўная і матэрыяльная культура), псіхалагічнага (псіхічны склад, свядомасць) характару пры наяўнасці ў яе членаў групавой самасвядомасці (этнічная самасвядомасць), якая адлюстроўвае ўвесь комплекс пералічаных асаблівасцей і параўноўвае сваю супольнасць з іншымі па дадзеных прыкметах.

**Нацыя** – (ад лацін. natio – племя, народ) – этнасацыяльная супольнасць, што прыходзіць на змену народнасці і характэрызуецца новай ступенню кансалідацыі і інтэграцыі грамадства; для яе ўласцівы агульная нацыянальная самасвядомасць, агульная мова (прычым дыялектныя гаворкі ўступаюць месца літаратурнай мове), нацыянальная школа, агульнасць эканамічнага і палітычнага жыцця, адзіная эканамічная і інфармацыйная прастора, нарэшце, агульная этнічная тэрыторыя і народны характар, стэрэатып паводзін, нацыянальны менталітэт.

**Народная культура** ствараецца ананімнымі творцамі, якія не маюць прафесійнай падрыхтоўкі**. Нацыянальная культура** ёсць сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, што створаны нацыяй як супольнасцю людзей, што маюць агульную гісторыю, мову і рысы нацыянальнага характару, на падставе чаго ўсведамляюць сваю адметнасць і непадобнасць да іншых.

**Этнічная музыка** альбо **музычны фальклор** – песенная і інструментальная творчась народа. Творы народнай музыкі ўзнікаюць на аснове мясцовых традыцый, адлюстроўваюць калектыўна выпрацаваныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычныя прынцыпы народа. У працэсе вуснай перадачы твораў кожнае пакаленне ўдзельнічае ў іх адборы, асэнсаванні, шліфоўцы. Народная музыка ахоплівае ўсе бакі жыцця народа: абрадавыя дзействы, святкаванні, звычаі , працу, адпачынак, побыт.

## РАЗДЗЕЛ I. Беларуская этнафонія ў рэчышчы культурнай антрапалогіі

### *Тэма 1.* Культура і традыцыя ў культурнай антрапалогіі

Пытанні:

1. Культурнаантрапалагічная дэфініцыя культуры.
2. Аўтахтоннасць і міграцыйнасць культур.
3. Спецыфіка традыцыйнай культуры Беларусі.
4. Этапы гісторыі Беларусі.
5. Маргінальнасць сучаснай культуры.
6. Кагнітыўная і нейрапсіхалагічная неабходнасць існавання традыцыі.

Літаратура:

1. Говард, Майкл. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард / Пер. с англ. І.Карпікавай, М.Раманоўскага, А.Шыманскага; Пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія; Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.
2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.
3. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.
4. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь; 1996. – 208 с.: іл.
5. Клюев, Е.В. Речевая коммуникация: Учеб. пособие дая ун-тов и вузов / Е.В. Клюев. – М.: Изд-во «ПРИОР»; 1998. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Мыльников, А.С. Язык культуры и вопросы изучения этнической специфики средств знаковой коммуникации/ А.С. Мыльников // Этнографическое изученне знаковых средств культуры. – Л.: Наука; 1989. – с. 7-38.

Культура – тое, як мы думаем і як узаемадзейнічаем з наваколлем. К у л ь т у р а – *агульнапрынятыя формы мыслення і паводзін*. У гэтых межах цалкам месціцца ўсё жыццё асобы. Безкультурных людзей не існуе. Усе яны далучаны да той ці іншай культуры.

■ Іншая справа, што ў межах сучасных сацыяльных абяднанняў (напрыклад краін) існуюць некалькі ўзаемазнітаваных і, часам, ўзаемапранікнёных культур. Так, у савецкай Беларусі адначасова існавалі культуры: беларускамоўных жыхароў вёсак; пераважна рускамоўных жыхароў гарадоў; польска-беларускамоўных беларусаў-каталікоў; рускамоўных габраяў.

Словы «культура» і «традыцыя» часцяком ужываюць як сінонімы. Асабліва, калі йдзе гаворка пра лад жыцця земляробаў і жывёлаводаў, пра фальклор і вуснапаэтычную творчасць. Больш глыбока пад «т р а д ы ц ы я й » маюць на увазе *генетычна стабільны, ураўнаважаны, самадастатковы лад жыцця*. Носьбіты яго паўнаякасна забяспечваюць усе свае патрэбы адно калькай[*] лада жыцця старэйшых генерацый.

Адрозніваюць аўтахтонныя і міграцыйныя культуры.

| ***Культура*** | |
|---|---|
| Аўтахтонная | Міграцыйная |
| яе стварыла мясцовае насельніцтва | яе прынеслі людзі, якія аднекуль прыйшлі |

Традыцыйная культура Беларусі аўтахтонна-міграцыйная па паходжанню. У ёй захаваны адбіткі культур старажытнага

[*] Калька – копія, капіраванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палеаеўрапейскага[**] насельніцтва (людзей, якія жылі тут да IV-III тысячагоддзя да нашай эры), балтаў[***] (якія рассяліліся на беларускіх тэрыторыях на мяжы III-II тысячагоддзяў да нашай эры), славянаў (якія рассяліліся на беларускіх тэрыторыях у 6-10 стагоддзях нашай эры). Гэта – сведчанне надзвычайнай трываласці, вялікага адаптацыйнага патэнцыялу беларускай традыцыйнай культуры.

У XX стгоддзі мала якія культуры існуюць замкнёна, самі па сабе. Большасць з іх узаемадзейнічае і ўзаемапранікае.

■ Так, вясковыя жыхары едуць у гарады і далучаюцца да урбанізаваных[****] культур; лацінаамерыканцы і еўрапейцы імкліва амерыканізуюцца пад уплывам ЗША; жыхары розных рэгіёнаў СССР у свой час актыўна далучаліся да рускамоўнай савецкай культуры.

Такія змены актыўна мяняюць лад жыцця людзей. Ва ўмовах іншай культуры яе неафіты[*****] па-іншаму здабываюць сабе ежу, жыллё, шлюбных партнёраў, па-іншаму размаўляюць і выхоўваюць дзяцей. Неўзабаве ў іх асяродку знікае «матчыная» традыцыя. Аднак, часам другая культурная супольнасць не спяшаецца іх прыймаць. Неафіты выракаюцца ад «матчынай» культуры, але застаюцца недалучанымі да новай – чужой. Яны застаюцца існаваць «на мяжы» розных культур, не далучанымі кардынальна ні да адной з іх. Часцяком у масавым ліку, што стварае адмысловыя культуры. Такія культуры – м а р г і н а л ь н ы я . Існаванне «на мяжы», неўключанасць у агульнае ўсталяванае жыццё наваколля стварае праблемы для носьбітаў маргінальных культур. Ад індывідуальных стрэсаў, самазабойстваў, асацыяльных формаў паводзін да масавых дзеянняў, якія ствараюць нестабільнасць у грамадстве.

Дынамічнасць, адрыў ад каранёў – лозунгі сучаснай заходняй цывілізацыі. Таму маргінальныя культуры інтэнсіўна колькасна

[**] Палеаеўрапейцы – насельніцтва Еўропы каменнага веку (палеаліту).
[***] Балты – індаеўрапейскае племя. Сучасныя народы балтыйскай моўнай групы – літоўцы і латышы.
[****] Урбанізацыя – рост буйных гарадоў.
[*****] Неафіт – новадалучаны да нейкай супольнасці чалавек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павялічваюцца. Такія акалічнасці культурных зменаў выклікаюць неабходнасць існавання т р а д ы ц ы я н а л і з м а . Сёння ён існуе на ўзроўні *філасофіі* (Рэне Генон, Аляксандар Дугін); *дзяржаўнай палітыцы* (заканадаўчая падтрымка этнічнай культуры); *бытавых паводзін* (фальклорны рух). Краіны, якія ў ХХ стагоддзі знайшлі «залатую сярэдзіну» паміж традыцыяй і індустрыялізмам, забяспечылі сабе відавочную сацыяльную стабільнасць: эканамічную раўнавагу, псіхалагічны камфорт і вялікую працягласць жыцця грамадзян, сталае міжнароднае рэнаме. Гэтыя працэсы распачаліся ў сярэдзіне ХХ стагодзя (Швейцарыя, краіны Скандынавіі, Японія, Ізраіль), працягваюцца напрыканцы яго (Эстонія, Латвія, Літва).

### *Тэма 2.* Беларуская спеўная традыцыя: погляд антраполага

Пытанні:

1. Камунікацыя як складальнік культуры.
2. Традыцыйная камунікацыя: адрасаты і адрасанты.
3. Каляндарная, працоўная, сямейна-абрадавая спеўная культура як рэшткі тэафаніі.
4. Ядро этнічнай спеўнай культуры.
5. Падставы формульнасці і сістэмнасці этнафоніі.

Літаратура:

1. Говард, Майкл. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард / Пер. с англ. І.Карпікавай, М.Раманоўскага, А.Шыманскага; Пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія; Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.
2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.
3. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Клюев, Е.В. Речевая коммуннкация: Учеб. пособие дая ун-тов и вузов / Е.В. Клюев. – М.: Изд-во «ПРИОР»; 1998. – 224 с.
5. Мыльников, А.С. Язык культуры и вопросы изучения этнической специфики средств знаковой коммуникации/ А.С. Мыльников // Этнографическое изученне знаковых средств культуры. – Л.: Наука; 1989. – с. 7-38.

Камунікацыя – адзін з найважнейшых складальнікаў культуры. Каб арыентавацца ў наваколлі, яго трэба асэнсаваць. Усё, што немагчыма зразумець, звычайна выклікае занепакоенасць, пачуццё жаху. Адсюль – патрэба ў звестках пра наваколле і – адсюль натуральна – патрэба ў зносінах. Каб забяспечыць сабе існаванне ў пэўным асяродку, трэба яго вытлумачыць і наладзіць з ім кантакт. Гэта абумоўлена нейрафізіялогіяй – акалічнасцямі функцыявання чалавечага мозгу.

Таму адна з самых вялікіх патрэб чалавека – патрэба ў зносінах. Зносіны, кантакты людзі ажыццяўляюць шляхам абмену інфармацыяй. *Абмен інфармацыяй* – камунікацыя. Яе заўсёды ладзяць паміж двума бакамі. Бок, які транслюе (перадае) інфармацыю – адрасант, які інфармацыю засвайвае (прыймае) – адрасат.

Асаблівасці беларускай традыцыі – сведчанне спецыфічнай камунікацыі яе заснавальнікаў. Гэта – рэшткі іх культуры, якія захаваліся дагэтуль. Найвялікую колькасць адбіткаў пакінулі найбольш жыццяважныя формы камунікацыі. Гэта – перадусім сакральная* камунікацыя: зносіны паміж чалавекам і сіламі, якія, па яго разуменню, уплывалі на ўмовы яго жыцця: сязоннасць, дабрабыт, долю. Да такіх праяў перш-наперш дапасуюць каляндарную, працоўную, сямейна-бытавую абраднасць.

Самавітай часткай іх з'яўляюцца праявы, якія навукоўцы ў свой час пачалі вылучаць з традыцыйнага ладу жыцця і тлумачыць як «народнае мастацтва». «Гукавую партытуру» т.зв. «музычна-фальклорных» праяў

* Сакральны – не будзённы, святочны, які знітаваны са звышнатуральным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчыма разглядаць як «этнафонію». Э т н а ф о́ н і я – *асаблівасці стыляў і манер выканання ў межах пэўнай традыцыі*.

Па даследаваннях этнамузыколагаў, ядро спеўнага стылю беларусаў – каляндарна-песенная культура. Яе таксама завуць «раннетрадыцыйная працоўная і каляндарная класіка песень». Яна значна паўплывала на больш познія спеўныя жанры, шмат у чым спарадзіўшы іх. Каляндарныя песні – сродкі камунікацыі паміж людзьмі традыцыі і сіламі, якія, па іх разуменню, ўплываюць на сязоннасць. У такіх зносінах: чалавек (спеўная грамада) – *адрасант*, прыродны цыкл – *адрасат* камунікацыі.

«Слоўнік» мовы зносін у такіх акалічнасцях складзены з тыпавых напеваў. Як сведчыць рэчаіснасць, яны больш устойлівыя, чым вербальная[**], моўная фанетыка. Таму ва Усходняй Еўропе ў розных краінах да аднаго каляндарнага адрэзку часам прымеркаваны падобныя, альбо аднолькавыя тыпы напеваў.

■ Так аднымі, альбо вельмі падобнымі напевамі беларусы і літоўцы сустракаюць Вялікдзень, Юр'я, суправаджаюць жніво. Справа тут у тым, што вытокі іх земляробчых каляндарных святаў – у агульнай культуры старажытных балтыйскіх плямёнаў, што рассяліліся на тэрыторыя Беларусі і Літвы на мяжы III і II тыс.да н.э.

Вывучэнне этнафоніі мае на ўвазе слуханне жывых носьбітаў традыцыі (іх аўдыёзапісаў) і пераймаггне стылю і манеры спеваў. Для трансляцыі этнафанічнай традыцыі недастаткова захоўваць яе ў нотнай фіксацыі. Нотны запіс мае пэўныя абмежаванні. Часцяком ён не дастаткова дакладна перадае гукавысотнасць спеваў. Тыя, хто робіць расшыфроўкі фоназапісаў, часам не фіксуюць пэўныя мелізмы, фаршлагі, якія не ўкладаюцца ў рамкі звыклага ім акадэмічнага вакалізавання.

■ Гукавысотная градацыя ў фальклорных спевах не заўсёды ½ тона, як у тэмпераваных ладах заходнееўрапейскай акадэмічнай музыкі. У традыцыйнай музыцы Турцыі найменьшая гукавысотная градацыя – ¼ тона,

[**] Вербальны – складзены са словаў, знітаваны з мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фіна-угорскія народы (мардоўцы, венгры) выкарыстоўваюць безпалутановыя лады – пентатоніку.

Этнафанічныя асаблівасці – адзнакі культуры народа. Пры становішчы, калі яны губляюцца, неўзабаве знікае і сама культура як арыгінальная цэласная з'ява. Таму на захавальніках традыцыі (у тым ліку і этнафанічнай) – вялікая адказнасць за трансляцыю культуры. У пэўных умовах захаванне культуры – умова магчымасці існавання народа ўвогуле.

## *Тэма 3.* Умовы дзейнасці спецыялістаў - захавальнікаў традыцыі на Беларусі

Пытанні:

1. Сэнс дзейнасці.
2. Камунікацыйныя мэты, інтэнцыі і перспектывы.
3. Прававая база.
4. Месца ў галінах дзяржаўных інстытутаў культуры і адукацыі.

Літаратура:

1. Говард, Майкл. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард / Пер. с англ. І.Карпікавай, М.Раманоўскага, А.Шыманскага; Пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія; Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.
2. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.
3. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь; 1996. – 208 с.: іл.
4. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.: Просвешение; 1986. – с.356-366.

Як сведчыць рэчаіснасць, да апошніх часоў у «натуральным» (вясковым) асяродку беларуская традыцыя сама сябе трансліравала. Ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмовах урбанізаваных сучасных культур яна самастойна трансліраваць сябе не здольна. Гэта вымагае дзяржаўнаарганізаванай дапамогі з боку спецыялістаў-захавальнікаў.

С э н с дзейнасці спецыялістаў, якія займаюцца *народным мастацтвам – спрыяць яго далейшай трансляцыі* ў часе. Вядома, пажадана з найменшымі якаснымі і эстэтычнымі стратамі. Гэта, фактычна, з'яўляецца і м э т а й іх дзейнасці.

■ Непрафесійна і несумленна спрыяць трансляцыі ўзораў мастацтва, якія не маюць нічога агульнага з сапраўднай аўтэнтычнай культурай краіны, на сродкі якой дзейнасць па тр-і наладжана. Калі кранацца этнафоніі, то: беларуская песня, якую спяваюць у неадпаведнай манеры ператвараецца проста ў набор нотаў і вербальнага тэксту. Эстэтычна і з пункту гледжання культурнай антрапалогіі гэта не *з'ява беларускай культуры і традыцыі*, а *з'ява маргінальнай постсавецкай культуры*. Іншымі словамі сурагат, падробка, якая не мае каштоўнасці і неадпаведная функцыянальна.

Як вядома, ўсе працэсы, што адбываюцца пры зносінах паміж людзьмі, магчыма разглядаць як камунікацыю. Мэтанакіраваная і рацыянальная дзейнасць ужо перад пачаткам камунікацыйнага акту мае на ўвазе дзеля чаго яна наладжана, якімі сродкамі будзе ладзіцца і да якіх наступстваў прывядзе. Перад пачаткам працы варта думаць, *каму* і *дзеля чаго* яна трэба.

Мэта, што вызначана вышэй, патрабуе адпаведнай камунікацыйнай стратэгіі, камунікацыйных інтэнцый*, разумення камунікацыйных перспектыў сваёй дзейнасці з боку спецыялістаў-захавальнікаў.

Камунікацыйныя с т р а т э г і я шмат у чым вызначана пазіцыяй дзяржавы. Дзейнасць, што спрыяе трансляцыі традыцыі, мае прававую падтрымку на розных узроўнях.

■ «Рэкамендацыі пра захаванне фальклору» ЮНЭСКА (рэзалюцыя прынята на 32-м пасяджэнні 15 лістапада 1989г.); «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры» РБ на 1994-1996гг., рэалізацыя пэўных

---

* Інтэнцыя – спосаб пераводу стратэгіі ў практыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палажэнняў якой працягваецца (гл. даклад міністра культуры РБ на VI Еўрапейскай канферэнцыі IOV 22.09.97г.); Дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма «Культура» 1997г.; пэўныя раздзелы закона «Аб культуры» РБ і інш.

Такі самавіты пласт у заканадаўстве павінны не заставацца па-за ўвагай адказных асобаў – адміністратараў. Распрацаваныя механізмы *ператварэння стратэгіі ў практыку* (і н т э н ц ы й) абумоўлены будовай дзяржаўных інстытутаў: апарата кіравання, дзяржаўнай сістэмай адукацыі і выхавання (дашкольныя установы, школы, ССНУ, ВНУ). Этнакультурная дзейнасць падпадае пад агульныя правілы.

У дзяржструктурах прадугледжаны пасады, якія адказваюць за выкананне адпаведных нарматыўных актаў, якія тычацца традыцыйнай культуры.

■ Гэта інспектары па выхаваўчай рабоце міністэрый, загадчыкі аддзелаў культуры і адукацыі райвыканкамаў, загадчыкі аддзелаў РАНА па выхаваўчай рабоце, супрацоўнікі рэгіянальных метадычных цэнтраў народнай творчасці. Сярод гэтых людзей часам сустракаюцца добрыя прафесіяналы, якія арыентуюцца ў пытаннях традыцыйнай культуры і сумленна ставяцца да сваіх абавязкаў, могуць аказаць рэальную дапамогу спецыялістам, якія непасрэдна працуюць з носьбітамі традыцыі і з дзецьмі і моладзю, якія да традыцыі далучаюцца праз адукацыйную і выхаваўчую дзейнасць.

У краіне наладжана сістэма фестываляў народнага мастацтва, дзе фальклорныя калектывы маюць магчымасць заявіць пра сябе. Гэта міжнародныя фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах (усе жанры), «Сожскі карагод» у Гомелі (харэаграфія). Апошнім часам моцна заявілі пра сябе як скіраваныя на этнічныя аўтэнтычныя формы фэсты «Беларуская полька» (пераважна харэаграфія) і «Берагіня» у г.п. Акцябрскі (усе жанры). Шмат фестываляў featureрознага ўзроўню, дзе магчымы ўдзел

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных калектываў, ладзяць ва ўсім свеце. Выхад на інфармацыю пра іх магчыма наладзіць праз інтэрнет.

Некалькі рэспубліканскіх ВНУ рыхтуюць спецыялістаў у галіне народнай культуры.

■ Сярод выпускнікоў Факультэта народнай культуры БДзПУ ёсць атрымаўшыя спецыялізацыю «настаўнік сусветнай культуры і кіраўнік фальклорнага гуртка». БДУ культуры і мастацтваў рыхтуе па наступных спецыялізацыях: «кіраўнік народнага калектыву і выкладчык музыкі», «артыст фальклорнага ансамбля і кіраўнік народнага калектыву», «кіраўнік аркестра і ансамбля народных інструментаў», «кіраўнік народнага харэаграфічнага калектыву» і г.д. Па сходных спецыялізацыях рыхтуюць вучэльні мастацтваў і музычныя вучэльні.

Спецыфіка працы фальклорнага ансамбля ва ўмовах дзяржсістэмы адукацыі і выхавання распрацавана яшчэ ў часы былога СССР. Такія тыпавыя дакументы як «Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ» і шматлікія больш сучасныя распрацоўкі *абавязкова* прадугледжваюць азнакамленне навучэнцаў з р э г і я н а л ь н а й спецыфікай фальклорных праяў.

■ Гэта знаходзіць падтрымку і ў правілах удзелу ў рэгіянальных фальклорных фэстах у Расіі і Балтыі, дзе калектывы, што не адпавядаюць традыцыі сваёй мясцовасці, мікрарэгіёну*, не маюць права выступаць.

## Раздзел ІІ. Складаючыя спеўнай этнафоніі

### *Тэма 4.* Спеўная манера: гуказдабыванне

<u>Пытанні:</u>

1. Мова.
2. Арфаэпіка.
3. Натуральнасць і глыбіня.
4. Грудныя рэзанатары.

---

* Мікрарэгіён – «раён» як адміністрацыйная адзінка, населены пункт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Агласоўка.

6. Дыфтонгі.

7. Этнафанічная расшыфроўка.

<u>Літаратура:</u>


1. Емельянов, В.В. Развнтие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

9. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

10. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

Асаблівасці фальклорных спеваў непарыўна звязаны з народнымі гаворкамі, асаблівасцямі вымаўлення.

Згодна даследаванням лінгвістаў, у кожным старажытным паселішчы першапачаткова была ўласная мова. Насельніцтва беларусі ў III тыс. да н.э. лічаць ужо складзеным са сваеасаблівых *этнаграфічных груп* са сваімі культурамі і гаворкамі. У далейшым мясцовыя аўтахтоны сутыкнуліся з моўным уплывам з боку фіна-ўгорскіх, балтыйскіх, кельцкіх, ілірыйскіх, іранскіх, готскіх, славянскіх* гаворак. Адбіткі ўсіх гэтых кантактаў працягваюць існаваць ў нашай тапаніміцы і гідраніміцы**. Фанетыка традыцыйных гаворак таксама захавала ўспамін пра ўсе этапы этнагенезу беларусаў. У пэўны момант перад кожнай *нацыяй* стаіць праблема стварэння агульнапрынятай літаратурнай мовы. Латынь і стараславянскую мову ў гарадской культуры Еўропы напрацягу XIII-XVIII стст. паступова выціскалі літаратурныя мовы новаўтвораных нацый. Пэўныя фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці познесярэднявечна-адраджэнскага маўлення, якія зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах, дазволілі навукоўцам гаварыць пра фармаванне *беларускай народнасці* ў XIV ст. На пачатак XX ст. прыпадаюць першыя беларускія граматыкі. Гэта зусім не з'яўлялася выключэннем: на мяжы XIX/XX стст. з неабходнасцю стварэння ўласнай літаратурнай мовы сутыкнуліся грэкі, габраі, туркі-сяльджукі. Уводзіны ў жыццё народа нашых граматык знітаваны з дзейнасцю Якуба Коласа, Язэпа Лёсіка, Браніслава Тарашкевіча***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Сучасныя народы *фіна-ўгорскай* моўнай групы: фіны, эстоны, мадьяры (венгры), мардоўцы. Кельты, готы, ілірыйцы, скіфы, іранцы – плямёны часоў Эпохі бронзы *індаеўрапейскай* моўнай групы.

** Тапаніміка – назвы мястэчак. Словы «бярэсце», «брэшча» маюць кельта-ілірыйскія карані; «мазыр» – іранскія. Гідраніміка – назвы вадаёмаў. «Усса» – фіна-ўгорская назва; «» – ... .

*** У выніку шэрагу акалічнасцяў граматыка-фармалізуючы працэс у беларускай мове знаходзіцца ў незавершаным стане. Не выключана, што філолагі будуць прапаноўваць больш набліжаныя да нацыянальнай арфаэпікі граматычныя сістэмы.

Вядома, што літартурная мова не заўсёды здольна адлюстроўваць усе асаблівасці *маўлення*, нават *агульнапрынятага* ў геаграфічных межах існавання народу.

■ Так, напрыклад, у расійскай мове існуе тры фанетычна розныя літары «и», напрыклад, у словах: «жить», «лить», «религия». Аднак, гэта не пазначаюць пры напісанні. Літоўцы афіцыйна выкрэсліваюць па некалькі фанетычных відаў галосных літар: *«і»:* «і» - «і кароткае», «į» - «і доўгае (насавое)»; *«е»:* «е» - «э», «ę» - «э насавая», «ė» - «э вузкая».

І амаль ніколі літаратурная мова не пакдрэслівае *дыялектычныя* асаблівасці *мясцовых гаворак* розных рэгіёнаў. Дыялекталогія ў мовазнаўстве, этнамузыкалогіі і этнафоніі – буйная галіна навукі.

У параўнанні з суседнімі (асабліва з расійскай) беларуская мова больш «глыбокая». У нас амаль няма насавых літар, якія сустракаюцца ў літоўцаў, часцей у латышоў і эстонцаў, немцаў і англічан. Вядома, гэта адлюстравана і ў традыцыйных спевах Беларусі. У маўленні беларусаў, як і ў іх традыцыйных спевах, актыўна задзейнічаны грудныя рэзанатары. Глотка пры гэтым пераважна шырока адчынена, гартань звычайна апушчана долу. У беларускай спеўнай традыцыі, беларускай этнафоніі гэта шмат у чым дасягнута за кошт а г л а с о ў к і і фаршлагаў.

■ Агласоўка – фанетыка-акустычная асаблівасць спеваў, пры якой да галосных гукаў, калі яны распеты больш чым на адну ноту, далучаюць зычны гартанны «г». Напрыклад: спяваюць не «да - а - мой» а «да – (г)а - мой». Прычым на слог з літарай «г» у такіх вытадках звычайна трапляе вакальна-акустычны акцэнт, які робяць дыяфрагмай (яна імкліва падымаецца ўгору, пасылаючы вялікі аб’ём паветка праз звязкі, горла шырока расчыняецца, часам, нават, з дапамогай скіўіцы). Цікава, што такую агласоўку магчыма сустрэць не толькі ў палескіх напружаных па гуку песнях, але ж і (у больш сціплым, але цалкам заўважным выглядзе) ў лірычным меласе паўночнай Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці выканання пэўных галосных гукаў у беларускіх традыцыйных спевах патрабуюць адмысловага разгляду. Акрамя звычайнага набору галосных гукаў «а»-«о»-«у»-«э»-«і»-«ы» у іх магчыма заўважыць фанетычна-акустычныя з'явы, што нагадваюць дыфтонгі*. Акрамя гэтага, адні галосныя літары ў традыцыйных спевах часцяком замяняюць на іншыя.

■ Так слова «каляда» у заходнепалескай песні «Коляда, бэгла колядка» спяваюць як «колёд-уо». Якк бачым, літара «а» заменена на сугучча «уо», у якім «у» праспявалі хутка і упор робяць на «о». Слова «зялёны» у песні «Развівайся, зялёны дубочак» з Міншчыны спяваюць як «зялён-гэ» і г.д.

У сукупнасці такія асаблівасці наладжваюць свабодны праход гукавога патоку праз звязкі, палягчаюць спеўныя намаганні, надаюць ім своеасаблівы каларыт, непаўторную манеру, даюць моцную адкрытую голасную падачу гуку. Ёй звычайна валодаюць аўтэнтычныя беларускія спеўныя гурты. Чысціні захавання традыцыйнай спеўнай манеры спрыяе тое, што, у адрозненні ад прафесіяналаў, традыцыйны спявак не вылучае з песні вербальны і музычны тэкст. Аўтэнтычную манеру засвойваюць «цалкам», комплексна, часам без гукавысотнага і фанетычнага аналізу-раскладання. Дакладнае выкананне традыцыйных спеваў ва ўрбанізаваных умовах спевакамі-прафесіяналамі ж звычайна вымагае папярэдняй этнафанічнай расшыфроўцы тэксту песні.

### *Тэма 5.* **«Спеўны стыль: інтанаванне».**

Пытанні:

1. Лінеарнасць.
2. Манодыя.
3. Пачатковыя элементы шматгалосся, паліфоніі, кантрастна-лінеарнае шматгалоссе.
4. Інтанацыя: праходная інтэрваліка, унісоны.

---

* Дыфтонгі – двайныя літары. У літоўскай мове з 22 дыфтонгаў вылучаюць 6 «двугалосных»: «ai», «au», «ei», «ie», «ui», «uo». Кожную з дзвюх літар пры вымаўленні не адасабляюць, вымаўляюць заўжды злучана і дапасуюць да аднаго склада.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развнтие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

9. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

10. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спеўны с т ы л ь – *прыёмы інтанавання вакальнай мелодыі*. Як сведчаць даследаванні, людзі розных культур па-рознаму чуюць і выконваюць адныя і тыя ж мелодыі.

Па меркаванню этнамузыколагаў, аснова музычнага стылю беларускай традыцыі – каляндарна-абрадавыя і працоўныя песні, сямейна-абрадавыя песні.

Для стылю музычнага мыслення беларусаў (як носьбітаў традыцыйнай культуры) характэрна л і н е а р н а с ц ь .

■ Пра вялікі ўзрост каляндарнай абраднасці сведчаць і даследаванні культуролагаў. Апошнія лічаць каляндарныя святы першаснымі формамі протакалендара, якія маглі з’явіцца яшчэ ў палеаліце (каменным веку). Каляндарны мелас беларусаў мае адмысловыя асаблівасці ў розных рэгіёнах краіны. Але ж яго аналіз дазваляе акрэсліць агульныя дзеля краіны ўвогуле заканамернасці, якія тычацца, напрыклад, стылю музычнага мыслення. Гэта – найбольш агульныя законы, па якіх арганізаваны непаўторны «характар» музычных выказванняў.

Найбольш старажытныя спеўныя традыцыі Усходняй Еўропы рэпрызентаваны м а н о д ы я й .

■ Да выключна манадайных дапасуюць сучасныя традыцыйныя спеўныя стылі Беларускага Паазер’я (паўночная Беларусь) і суседняй Аўкштайтыі (паўднёвая Літва). З пэўнымі агаворкамі, якія знітаваны з уплывам шматгалосных касцёльных спеваў, да першапачаткова манадыйных дапасоўваюць спеўныя традыцыі Панямоння (Паўночна-заходняя Беларусь) і Міншчыны.

Манодыя, лінеарнасць музычнага мыслення накладае пэўныя адбіткі на інтанаванне традыцыйных песень аўтэнтычнымі спевакамі. Стыль, што заснаваны на такім падмурку, валодае разгорнутым малюнкам, гнуткай меладычнай лініяй. Яго адметныя рысы – фаршлагі, трыолі, розныя віды музычных упрыгожванняў, секундавые дывізі пры гуртавым выкананні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта апошнія, як лічаць, забяспечылі з'яўленне ў першасна манадыйнай культуры пачатковых элементаў шматгалосся. Да пачатковых элементаў шматгалосся ў беларускай спеўнай традыцыі дапасуюць гетэрафонію і бурдонны спеў. Гетэрафонія – своеасаблівае «расслаенне» адой харавой партыі, першапачаткова – з-за розных інтанацыйных уяўленняў спевакоў. У выніку фарміруюцца сякундавыя сугуччы, якія сталі для многіх рэгіянальных беларускіх песенных сістэм «фірменным знакам». Асабліва гэта распаўсюджана ў спеўнай культуры Ўсходняга Палесся (паўднёва-ўсходняя Беларусь). Усе галасы пры гэтым застаюцца раўназначнымі па важкасці, з развітымі меладычнымі малюнкамі. Бурдонны спеў адасабляе, разводзіць галасы на вядучыя, якія валодаюць разгорнутай мелодыяй і акампануючыя, якія спяваюць у вельмі вузкім амбітусе, часам, увогуле на адной ноце. Апошнія даюць песні, што выконваюць у такім стылі, моцную гарманічную «аснову», над якой «прапісываюцца» вядучыя галасы. Прызнанымі майстрамі такога стылю лічаць спевакоў Заходняга Палесся (паўднёва- заходняя Беларусь).

Калі розныя галасы ў традыцыйнай «партытуры» заўважна кантрапунктуюць, «спрачаюцца», з'яўляюцца пачатковыя элементы паліфоніі. Пры т.зв. спевах з падводкай (найбольш характэрных для Палесся), калі верхні – кантрапунктуючы – голас паднімаецца моцна дагары, магчыма весці гаворку пра падгалосачную паліфонію. Кантрасная паліфонія атрымліваецца пры выкананні песен канонам і антыфонам. Асобны момант, які адасабляюць этнамузыколагі – кантрасна-лінеарнае шматгалоссе: адначасовае гучанне розных музычных ліній у час абрадаў «Страла», «Барана», вясельных і пахавальных галашэнняў.

Такія стылявыя асаблівасці этнафанічнай музычнай "лексікі" дыктуюць своеасаблівую спецыфіку нацыянальнага інтанацыйнага складу беларускай спеўнай традыцыі. Тут у «прахадной» інтэрваліке не шмат кансануючых інтэрвалаў, сустракаюцца гукавысотныя суадносіны не толькі ½ тона, але ж і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

¼ тона. То, што гэта трэба спісваць на стылістычныя асаблівасці беларускай этнафоніі, сведчаць выдатна выстраенныя ў добра спетых спеўных гуртах унісоны.

Гамафонна-гарманічны тып шматгалосся (трох- ці чатырохгалосная акордавая фактура) сустракаецца ў позднетрадыцыйных спевах (асабліва на Панямонні) і як рэгіянальная асаблівасць спеўнага стылю некаторых мікрарэгіёнаў (напрыклад у спеўнай культуры басейна ракі Прыпяць).

## *Тэма 6.* Этнафанічны сінкрэтызм: элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніі ў спевах

Пытанні:

1. Раннетрадыцыйны фальклор як узор сінкрэтызму народнага мастацтва.
2. Рытуальная харэаграфія і яе пазнейшыя пераасэнсаваныя гульнёвыя формы: карагоды, гульні; традыцыйна-побытавы танец.
3. Акампанемент, скрыпка і дуда — традыцыйныя інструменты беларусаў у крыніцах этнографаў XIX — першай паловы XX ст.

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развитие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

9. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

10. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

Фальклор – мастацтва **сінкрэтычнае** (“сінкрэтызм” – з грэцк. “змешанне”), бо для яго характэрна аб’яднанне розных мастацтваў – слова, музычнага мастацтва, харэаграфічнага (карагодныя спевы, танцавальна-прыпевачны жанр), драматычнага мастацтва.

Беларускае народнае **харэаграфічнае мастацтва** бярэ свой пачатак у глыбокай старажытнасці. Яго элементы зарадзіліся яшчэ ў эпоху фарміравання ўсходне-славянскіх плямён і, прайшоўшы праз этап гістарычнай еднасці славян у Старажытнай Кіеўскай дзяржаве, леглі ў аснову самабытнай танцавальнай творчасці, развіццё якой адбывалася ў працэсе фарміравання беларускай народнасці, а потым і нацыі. Амаль да нашага часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бытавалі ў беларусаў, а некаторыя бытуюць і цяпер, такія старадаўнія абрады, святы, гульні, як каляды, купалле, дажынкі, «Жаніцьба Цярэшкі», «Страла», «Куст», «Каза», танец-гульня «Зязюля», шматлікія вясельныя звычаі (гл. Вяселле) і інш. Значнае месца ў іх займалі харэаграфічныя элементы, цесна звязаныя з песняй, драматызаваным гульнёвым дзеяннем. Паступовa танцавальнае мастацтва вылучылася з агульнага сінкрэтызму, стала на самастойны шлях развіцця і выкрышталізавалася ў асобны, па-мастацку завершаны від народнай творчасці.

Адным з найстарэйшых на Беларусі харэаграфічных жанраў, які захаваў сувязь з каляндарна-земляробчай і сямейна-бытавой абраднасцю, з традыцыямі першабытнага сінкрэтызму, з'яўляецца карагод. Паводле структурных і стылявых асаблівасцей ён займае як бы сярэдзіну трохвугольніка, утворанага трыма сумежнымі жанрамі фальклору — песняй, гульнёй, танцам, і мае комплекс падобных на іх рысаў. Адпаведна з гэтым беларускія карагоды падзяляюцца на 3 групы: карагодныя песні, гульнёвыя карагоды (з падгрупай карагодных гульняў) і карагодныя танцы. У карагодных песнях пры арганічным сплаве тэксту, мелодыі і харэаграфічнага дзеяння большае значэнне мае мелодыя; для іх характэрны нескладаны прасторавы малюнак і простае харэаграфічнае дзеянне (просты, велічны, урачысты крок, крок з прыстаўкай і інш.). У харэаграфіі адсутнічае прамое адлюстраванне тэксту песень. Яскравыя прыклады карагодаў гэтай групы — «Страла» (выканаўцы з песняй, узяўшыся за рукі, ідуць на ўскраіну вёскі), «Вуліца мала, карагод вялік», «Завілася пчолка», «Ох, ты, бяроза» і іншыя, дзе пад павольны рух удзельнікамі выяўляецца эпічны, лірычны і драматычны змест песень, «крывыя танкі» («Лука»), дзе спевакі рухаюцца, малюючы на плоскасці розныя крывыя акружнасці, ад здвоенай васьмёркі да асіметрычных фігур. У гульнёвых карагодах дасягаецца найбольш поўнае адзінства ўсіх трох кампанентаў, змест раскрываецца сукупнасцю выяўленчых сродкаў паэзіі, музыкі і харэаграфіі. Для паэтычнай і музычнай будовы гэтых карагодаў характэрны дыялагічнае выкладанне сюжэта,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апавядальны тон, больш хуткі тэмп і выразны рытм напеву. Нярэдкая з'ява — рытмічная кантрастнасць частак ці мелодый напеву і прыпеву паводле прынцыпу «марудна-хутка», тыповага для музычнай структуры беларускіх карагодаў. Напевы вызначаюцца індывідуальнай выразнасцю, чаргаваннем мінору і мажору.

Беларускія танцы вылучыліся з карагодаў (14 — 16 ст.). Асаблівасці харэаграфічнай структуры дазваляюць падзяліць іх таксама на некалькі груп. Першую. найбольш значную ў мастацкіх і колькасных адносінах, складаюць старажытныя традыцыйныя беларускія танцы «Лявоніха», «Мяцеліца», «Качан», «Бычок», «Таўкачыкі», «Крыжачок», «Гняваш», «Кола», «Мікіта». «Чобаты», «Лянок», «Верабей», «Юрачка» і многія іншыя, а таксама запісаныя ў апошнія гады «Малаточкі», «Певень», «Дожджык», «Кабылка», «Млынок», «Боб малаціць» і інш. Для іх структуры характэрны паўтаральнасць дзвюх-трох тыповых для нацыянальнай харэаграфіі музычна-пластычных формул, агульны для ўсіх удзельнікаў кампазіцыйны малюнак, масавае выкананне, частае песеннае суправаджэнне, неабмежаваная колькасць удзельнікаў і любы іх склад (нярэдка танцуюць пераважна жанчыны). Для музычнай структуры характэрны часцей за ўсё памер 2/4 (сустракаюцца і іншыя памеры), квадратнасць пабудовы мелодыі (сіметрычнасць чаргавання музычных фраз і сказаў), відавочная сувязь з песняй.

**Інструментальнае суправаджэнне** танца мае нярэдка тую ж ладава-інтанацыйную аснову, што і карагодная песня. Кароткія песні, якімі часта суправаджаецца выкананне танцаў у народным побыце, — у большасці выпадкаў скарочаныя, «астаткавыя» тэксты карагодных песень. Інструментальнае суправаджэнне мянялася ад эпохі да эпохі. Даўней асаблівай павагай карысталіся дудары. «Без дуды, без дуды // Ходзяць ногі не туды, // А як дуду пачуюць, // Самі ногі танцуюць», — прыпявалі беларусы. Побач з дудою ў 19 ст. танцам акампаніравалі скрыпка, цымбалы і бубен, пазней — дзве скрыпкі і басэтля складалі своеасаблівы нацыянальны аркестр,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

т.зв. траістую музыку. У 2-й палове 19 ст. ў народны побыт увайшоў гармонік. У наш час гармонік, баян, акардэон, а на вяселлях часам вакальна-інструментальныя ансамблі амаль зусім выцеснілі іншыя музычныя інструменты.

## Раздзел III. Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне і этнафонія

## *Тэма* 7. Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці

Пытанні:

1. Паазер’е і Панямонне.
2. Манодыя.
3. Мелізмы, развітая музычная арнаментыка.
4. Кантрастная паліфонія: антыфон, канон; кантрастна-лінеарнае шматгалоссе: абрад «Барана».
5. Камернасць і дынамічная стрыманасць выканання.

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развнтие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.
2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.
3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.
4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.
5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136 с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2 Віцебскае Паддзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М.Боганева, М.А.Козенка і інш.; Складальнік Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с.

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В.І. Басько [інш.]; аўт. Ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б.Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 208 с.: каляр. Іл.

10. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

11. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

12. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад П о ў н а ч ч у  Б е л а р у с і звычайна маюць на ўвазе Паазер’е і Панямонне.

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны П а а з е р ’ е (прыкладна адпавядае Віцебскай вобл.) і П а н я м о н н е (прыкладна адпавядае Гродзенскай вобл.) непасрэдна мяжуюць з паўночна-заходнімі суседзямі РБ – краінамі Балтыі і Польшчай.

■ Традыцыя поўначы Беларусі змяшчае адчувальныя адбіткі культурнага субстрату[*] балтаў. Мова і традыцыйная культура балтаў–індаеўрапейцаў[**] належыць да надзвычай архаічнага пласту індаеўрапейскіх. Сучаснікамі адасаблення балтыйскіх моваў ад агульнаіндаеўрапейскага моўна-культурнага адзінства былі такія мовы як старажытнагрэцкая мова і санскрыт [***] . Балты рассяліліся на беларускай поўначы, асімілюючы мясцовае палеалітычнае[****] насельніцтва на мяжы III-II тыс. да н.э. і праіснавалі амаль без іншакультурных дамешкаў ажно да X-XI стст. (тры тысячы гадоў), калі сюды сталі дасягаць хвалі славянскай і скандынава-варажскай каланізацыі.

Культурны субстрат балтаў на поўначы Беларусі адчувальны як нідзе. Ён адбіўся і на структурна-жанравай арганізацыі спеўнай культуры, і на яе этнафанічных асаблівасцях.

■ Да адбіткаў культурнага субстрату балтаў на структурнай арганізацыі паўночнабеларускай спеўнай культуры магчыма аднесці: саму *арганізацыю спеўнага календара* (Благавешчанне – Pavasario ligė, Вялікдзень – Velykos, Купалле – Kupolių šventė, Багач – Dagotuvės, Дзяды—Vėlinės-Diedai, Каляды – Kaledų šventė); *музычную ідэнтычнасць асобных з асноўных групаў* каляндарных і працоўных песень (валачобныя, юраўскія, купальскія, жніўныя, калядныя).

На этнафанічных асаблівасцях паўночнабеларускіх песень варта спыніцца падрабязна.

Спеўная традыцыя Паазер'я – манадычная па тыпу музычнага мыслення. Яе часцяком параўноўваюць са спеўнай традыцыяй Дзукіі – паўночнай Літвы. Панямонская спеўная традыцыя стала шматгалоснай, як часам пазначаюць, пад уплывам гамафонна-гарманічных касцёльных спеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[*] Субстрат
[**] Балты-індаеўрапейцы – літоўцы і латышы, эстонцы належаць да фіна-ўгорскай моўнай групы.
[***] Старажытнагрэцкая мова – мова, санскрыт – мова .
[****] Ёсць падставы меркаваць, што этнакультурна збольшага гэта былі фіна-угры.

Манадыйнасць звычайна цягне за сабой развітую музычную арнаментыку, гнуткасць мелодый, распеўнасць. Не скаваныя другім голасам, уторай, спевакі адчуваюць рытмічную і меладычную свабоду.

Гэта выклікае імправізацыю, жаданне ўпрыгожыць знаёмую, кананічную мелодыю. Шматвекавая шліфофка спеўнага майстэрсва абумовіла існаванне арыгінальнага мясцовага спеўнага стылю з шматлікімі глісамі, фаршлагамі, рытмічнымі затрыманнямі. Асаблівасці якога захоўваюцца і пры калектыўным выкананні.

Да элементаў кантрастнай паліфоніі Паазер'я дапасуюць: антыфон, канон. Выкананне песень антыфонам мае месца, калі розныя песні адачасова спяваюць некалькі спеўных груп (спевакоў). Яно найбольш характэрна для веснавых і летніх песень: масленкавых, песень-загуканняў на Блавешчанне (мясцовая назва Благавешчання – 23 сакавіка), купальскіх песень.

Зафіксаваны і выпадкі выканання песень канонам. Калі адную і тую ж песню спяваюць дзьве, альбо некалькі спеўных груп (спевакоў). Уступ яны робяць па чарзе. Акрамя камерных канонаў існуюць і вельмі аб'ёмныя па колькасці галасоў – харавыя. Як яскравы прыклад магчыма прывесці напевы полацкага Купалля.

■ Антыфон і канон з'яўляецца з-за неабыходнасці абрадава значнага пераклікання, перагаворвання двух частак спеўнай грамады, якія месцяяцца на пэўнай адлегласці. Часам гэта гучыць ўвогуле як перакліканне спевакоў з двух суседніх вёсак. Спеўныя гурты пры гэтым вядуць голас не адыходзячы далёка ад роднай ваколіцы і мусяць імкнуцца, каб іх пачулі суседзі і адказалі паўторам музычнай фразы.

У 70-х гадах ХХ ст. Галіна Таўлай зафіксавала на Барысаўшчыне яскравы прыклад кантрастна-лінеарнага шматгалосся[*****] – абрад

[*****] Аднachасовае спалучэнне двух і больш музычных пабудоў, аднachасовае гучанне розных меладычных ліній.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Барана». Пры яго адпраўленні чатыры гурты спявачак становяцца вакол бараны і адначасова спяваюць музычна розныя песні чатырох пораў года. Бытаванне менавіта такіх пачатковых элементаў паліфоніі на Паазер'і, магчыма, мае сувязь з традыцыяй с у т а р ц і н е , якую лічаць арыгінальнай асаблівасцю паўночнай Літвы.

Яшчэ адна этнафанічная асаблівасць паазерскіх і панямонскіх песень – камернасць, лірычнасць. Магчыма, карані гэтага трэба шукаць у развітай музычнай арнаментыцы спеваў: рабіць тэхнічна складаныя пасажы на голасных спевах даволі нязручна. З асаблівым моцам гэтая стылістычная рыса (негучнасць, стрыманасць) спеўнай традыцыі Паазер'я і Панямоння адбіта на іх восеньскіх песнях.

### *Тэма 8.* **Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці**

Пытанні:

1. Беларускае Палессе.
2. Тыпы гетэрафоніі на Палессі.
3. Тыпы палескага шматгалосся.

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развитие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.4 Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.: каляр. іл.

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т.В.Валодзіна і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2012. – 910 с.: каляр. іл.

10. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

11. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

12. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

Даследчыкі XIX-XX стст. Культуру Палесся заўсёды адмяжоўвалі ад астатняй беларускай традыцыі, казалі пра яе самабытнасць. Яе асаблівасці (у тым ліку этнафанічныя) маюць падобныя рысы ў беларускім (Брэстчына і Гомельшчына), украінскім (Валынь), рускім (Браншчына) Палессі. Адначасова кажуць, што Палессе бессэнсоўна дзяліць – на беларускае, украінскае, польскае, а трэба ўспрымаць, як адзіны культурны кангламерат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СваеасабліВую гартаннасць моваў выхадцаў з Цэнтральнай Еўропы адзначалі прадстаўнікі срэдыземнаморскіх цывілізацый антычнасці. «Рэзкія» і «хрыплыя» галасы кельтаў і германцаў прыцягвалі ўвагу тубыльцаў Аттыкі і Апенін на мяжы Новай эры. Археалагічна зафіксаваны кантакты старажытнага насельніцтва Палесся са скіфа-іранцамі, готамі[4] (пач.н.э. – Брэстчына). Магчыма таму палескія дыялекты больш «глыбокія» па гучанню ў параўнанні з паўночнабеларускімі. Пры размовах і спевах паветраны струмень скіраваны не так набліжана да зубоў, хутчэй на нёба. Што ў спалучэнні з спецыфічнымі рухамі гартані і дыяфрагмы дае асаблівы характар гуку, больш моцнага, гартаннага, прамога ў параўнанні з блізкімі да вакалізавання, «пяшчотным» паўночнабеларускім.

Гучнасці і моцы дабаўляе палескім спевам і характар мясцовага традыцыйнага музычнага стылю. Спеўная культура беларускіх палешукоў – узор шматгалоснай традыцыі. Яе правамочна разглядаць як узоры зачаткаў паліфоніі, якія часцяком агулам завуць «рознагалоссем»: *гетэрафоніі*, *дыяфоніі* на бурдоннай аснове, уласна *паліфоніі*.

Гетэрафонія – полірытмічны тып манодыі. Яна з'яўляецца, калі вакальныя лініі розных спявачак, скіраваныя на ўнісон, часова разыходзяцца і ўтвараюць секундавыя (найчасцей) і іншаінтэрвальныя сугуччы. Гэта здараецца, напрыклад, калі адначасова: спявачка *n* распявае адзін слог на некалькі таноў і ў той жа час яе суседка *n1* спявае гэты слог на адным тоне. Апорныя таны і асабліва апошні ўнісон яны адчуваюць аднолькава і ў выніку мелодыя йдзе своеасаблівым чаргаваннем: унісонных апорных таноў, «пучкоў» сякундавых сугуччаў на нотах «праходных», доўгіх унісонаў на канчатках меластрафы. Працяглыя унісоны напрыканцы меластрафы, па заканчэнні якіх спявакі быццам бы пазбаўляюцца ад рэшткаў невыкарыстанага ў спевах паветра, сталі «фірменным знакам» паўднёвабеларускіх спеваў. Гетэрафанічныя галасы ўяўляюць

[4] Готы – плямёны эпохі Вялікай вандроўкі народаў (пач. І сяр. І тыс.н.э.) германскай моўнай групы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раўнавартаснымі, магчымы іх перакрыжаванні. Майстры гетэрафоніі – жыхары Усходняга Палесся.

Дыяфонія на бурдоннай аснове бывае ўтворана, калі адна група спявачак спявае ў вузкім амбітусе (магчыма нават на адным – асноўныя тоне), а другая «надбудоўвае» зверху ад гэтага «ўнісоннага падмурка», разгорнуты меладычны малюнак. Але нават пры бурданіраванні толькі на прымарным тоне традыцыйнай спявачкі далучаюць акцэнтыроўку, якая ажыўляе неразнастайны па гукавысотнасць матэрыял. Яна, хутчэй за ўсё, ідзе ад мясцовых узораў маўлення і складзена з імклівага падкрэслівання асобных нотаў імгненным пашырэннем аб'ёму паветранага струменя, што праходзіць праз звязкі. Гэта дасягаецца з дапамогай сінхронных рухаў гартані і дыяфрагмы. Часцяком фанетыка-акустычныя акцэнты прыпадаюць на аднолькавыя слогі ў розных партыях дыяфоніі, што надае спевам маналітнасць. Такія стылі завуць «бурдонны спеў» Заходняга Палесся.

Узоры ўласна паліфоніі (т.зв. «спевы з падводкай») – падгалосачна-паліфанічны склад палесскага шматгалосся – бывае ўтвораны пры вылучэнні са спеўнага гурта «падводчыцы». «Падводчыца» – спявачка з высокім голасам, якая разыходзіцца з гуртом у гукавядзенні: надбудоўвае зверху актаву, якая перыядычна з'яўляецца ў партыпуры і абавязкова гучыць на апошняй ноце меластрафы. Адрозніваюць падводку: «прамую» – спевы паралельнымі актавамі; імправізацыйна-арнаментаваную; «з закруткамі» – калі магчымы рознаінтэрвальныя сугуччы. Пры «фірмовых» – аўтэнтычных – спевах «з падводкай» вылучаясь ад гурта, вядучы голас наверх, спявачка-падводчыца не мяняе рэгістру спеваў, не пераходзіць у чыста галаўное рэзаніраванне. Гэта адбываецца шмат у чым за кошт руху гартані: яна не «цягнецца» за высокай нотай. Бывае ўтвораны хуткі прыгук-фаршлаг, у выніку якога гартань не ліпне да нёба, адсякаючы гуканне грудных рэзанатараў, а. хіснуўшыся, застаецца прыкладна ў першапачатковым становішчы, што дазваляе гучаць высокай ноце, узмацнённай і верхнімі і ніжнімі рэзанатарамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 9.* Усход Беларусі і Цэнтральная Беларусь: этнафанічныя асаблівасці

Пытанні:

1. Падняпроўе. Карагоднасць. Высокая тэсітура. «Пералівы», «падцягі».
2. Цэнтральная Беларусь. Сінтэтычнасць спеўнай сістэмы. Манадычная аснова.

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развнтие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1 Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А.Козенка і інш. – Мн: Бел. навука, 2001. – 797 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В.І.Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.: каляр. іл.

10. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

11. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

12. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускае Падняпроўе прыкладна адпавядае Магілёўскай вобласці, але ўключае Веткаўскі і Гомельскі раёны Гомельскай. Мяжуе са Смаленшчынай і Браншчынай. Гаворкі Магілёўшчыны лічаць найбольш блізкімі да арфаэпікі літаратурнай беларускай мовы. Заўважнае «аканье», «расцягі» маўлення. У традыцыйнай культуры і песенных з’явах беларускага Падняпроўя шмат агульнага з Смаленшчынай, Браншчынай, Усходняй Гомельшчынай.

Традыцыйная музыка Магілёўшчыны больш «паўднёвая» (рытмізаваная, танцавальная, з больш хуткімі тэмпамі) ў параўнанні з палескімі і паазерскімі ўзорамі. Найбольш адметным складальнікам падняпроўскага музычнага фальклору лічаць яго карагодна-гульнявы комплекс. Асабліва вядомы напевы, ў аснову якіх пакладзены рытмаформулы тыпу «Проса». Карагодныя рытмаформулы магчыма знайсці і ў каляндарных і працоўных песнях. Падобна, як і «карагодныя» рэфрэны: «ой, лялё-рана», «люлі-люлі».

Класічны ўзор падняпроўскіх карагодаў – жывая традыцыя песень Стралы на Веткаўшчыне, якія дагэтуль штогод спяваюць па старажытным месяцавым календары ў вёсках Неглюбка, Янова, Стаўбун, Казацкія Балсуны.

Веснавыя песні Падняпроўя «спалучаюць крык з тонкім лірызмам». У ніх звычайна вельмі высокая тэсітура (да рэ²). Гуканні – «Гу!» – на канцы рэфрэна абавязковы іх элемент. Ад карагодных (маторных, танцавальных), моцна акцэнтаваных спеваў прыйшло выкананне «прыступам, падгукам», калі, мяняючы гукавысотнасць, «ідуць наскокам у гору (бух ды бух)». Шлях да працяглых «апорных» нотаў напрыканцы рэфрэна часцяком пралягае праз фаршлагі, гартанныя прыгукі-глісы.

У гуртавым спеве пераважаюць узоры дыяфаніі, які вызначаюць як «спеў з пералівамі»: працяглымі (часцей тэрцовымі) расчапленнямі меладычнай лініі голасу, калі выканаўцы прыходзяць да ўнісона толькі напрыканцы фразы. Пры «пералівах» магчымы перакрыжаванні – «перакіды» галасоў, калі верхняя і ніжняя патрыя мяняюцца месцамі. Больш познім лічаць шматгалоссе з «падцягам» – своеасаблівым аналагам палескай «падводкі».

Сярод фалькларыстаў сустракаецца меркаванне (якое не дамінуе), што ў этнамузыкалогіі «Цэнтральнага рэгіёну не існуе». Сапраўды, у спеўнай культуры Міншчыны «перакрыжоўваюцца» стылі і манеры выканання абкружаючых яе гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Як адміністрацыйная адзінка, Мінская вобласць уключае ў сябе часткі этнаграфічнага Панямоння (Валожыншчына, частка Баранавічскага р.), Усходняга Палесся (Салігоршчына).

Пры падобнай з падняпроўскай блізкасці да літаратурнай мовы, мінскія гаворкі захавалі гіпертрафавана мяккае «с» як перад зычнымі, так і перад галоснымі: «сьвяты», «разаўюся»; замену канчатковага «е» на «я»: «буддзя», «ўзыйдзя», што нагадвае фанетычныя структуры літоўскай мовы, дзе «е», акрамя дыфтонгаў «іе», «еі» вельмі адкрытае, бліжэй да «я».

Калі ўлічыць геаграфічнае становішча, не дзіва, што этнафанічныя прыклады нідзе так не разнастайны, як у Цэнтральнай Беларусі, дэманструючы сінтэтычнасць спеўнай сістэмы рэгіёну, асаблівасці якой склаліся пад уплывам суседніх. Аднак, падаецца, што можна агулам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(схематычна-спрошчана) дапасаваць яе спеўную культуру ўсё ж да традыцыі Поўначы Беларусі. Спеўная сістэма Цэнтральнай Беларусі характэрызуецца яскрава манадычнай асновай, разгорнутым меладычным малюнкам са шматлікімі ўпрыгожваннямі, глісамі, фаршлагамі, «напоўненнымі» (за кошт спецыфічнага гукавыймання) хадамі шырокіх інтэрвалаў.

Дамінуючым тыпам шматгалосся ў харавым спеве Мінскай вобласці з'яўляюцца хутчэй, «пераліўы» і «падцягі», пры лакальных праявах «бурдоннага спеву» і «падводкі».

Сярод ладоў песень распаўсюджаны ангемітонавыя (натуральныя) лады і ладавая пераеменнасць, калі дадатковыя знакі альтэрацыі сустракаюцца толькі ў запевах.

## Раздзел IV. Асновы методыкі ў этнафоніі

### *Тэма 10.* Уключанае назіранне і этнафонія

Пытанні:

1. Культурна-антрапалагічны метад уключанага назірання.
2. «Вакальная рэвалюцыя» Дзмітрыя Пакроўскага.
3. Дзейнасць беларускіх этнамузыколагаў.

Літаратура;

1. Белорусская этномузыкололгия: очерки истории (XIX – XXвв.) / ред. З. Можейко. – Минск: Тэхналогія, 1997. – 248 с.: нот.

2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

3. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

М е т а д  у к л ю ч а н а г а  н а з і р а н я ў культурнай антрапалогіі мае на ўвазе *непасрэдны кантакт у мэтах вывучэння культуры з носьбітамі культуры, якую вывучаюць*. Згодна яму, даследчыкі пэўны час павінны пражыць ва ўмовах жыцця людзей, якія з'яўляюцца аб'ектам іх даследванняў. Важнасць яго пры засваенні фальклору абумоўлена характарам існавання фальклору.

Фальклорная традыцыя мае на ўвазе непасрэдную вусную передачу. Традыцыйныя спевы і танцы зацвярджаюцца «з голаса на голас», «з нагі на нагу». Малодшае пакаленне спевакоў і танцораў, назіраючы за старэйшымі, вучыцца ў ніх і паступова далучаецца да спеваў і танцаў. Такі спосаб перадачы забяспечвае арганічнасць, захаванне аўтэнтычных (сапраўдных) стылю і манеры выхавання. Пры далучэнні да традыцыі з пісьмовых крыніц (нотнага запісу і схем танцаў) часцяком у выніку атрымліваюць з'яву іншай культуры. Якія знітаваны з заходнееўрапейскай прафесійнай акадэмічнай выканальніцкай культурай. Адбываецца, фактычна, падмена арыгінальных узораў мастацкіх праяў на іншыя, якія ўяўляюць сабой рознастайныя сурагаты традыцыі.

Пачынаючы з хора Пятніцкага (пачатак XX ст., Расія) на абшарах імперыі панавала «акадэмізаванае» народнае спеўнае мастацтва. Яго прадстаўнікі старанна імкнуліся «акультурыць», народныя спевы, «упрыгожыць» іх, «дацягнуць да ўзроўню» акадэмічнага мастацтва. Узмацнёна прапагандаваліся аранжыроўкі народных твораў у рэчышчы гамафонна-гарманічнага стылю гармоніі венскай класічнай школы. Ствараліся этнафанічныя ўзоры, якіх «жыўцом», «у натуры» ніколі не існавала: народныя хары на 50-100 спявакоў, аркестры народных інструментаў на 50-100 музыкаў. Савецкія прафесійныя музыканты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працягвалі гэтую тэндэнцыю, шырока ставілі яе «на паток». У выніку амаль кожная абласная філармонія часоў СССР мела калектывы такога гатунку.

«Новыя паветрыя» ускалыхнулі творчае жыццё СССР толькі ў 60-70-х гг XX ст. На ўзроўні метраполіі яны звязаны з дзейнасцю Дзмітрыя Пакроўскага і створанага ім «Ансамбля Дзмітрыя Пакроўскага». Шукаючы «сапраўдны» народны спеўны гук ён шырока практыкаваў «м е т а д у к л ю ч а н а г а  н а з і р а н н я ».* Шматлікія фальклорныя экспедыцыі, сажанне на коней, каб засвоіць спеўныя прыклады казакаў і шмат што яшчэ давалі адчувальны плён. Часам тых, хто жадаў спяваць у яго гурце, ён накіроўваў па пэўнаму вясковаму адрасу з заданнем засвоіць спеўную манеру альбо прыёмы выканання на аўтэнтычным інструменце ад мясцовага жыхара. Тых, хто вытрымліваў «выпрабаванне» і праз паўгода-год мог нешта «сапраўднае» прадэманстраваць, прыймалі ў гурт. Ансамбль набыў вялікую папулярасць сярод інтэлігенцыі. Новае пакаленне гараджанаў занава адкрывала для сябе народную рускую музычную культуру, атрымлівала эстэтычнае задавальненне, якое манернае «лубочнае» мастацтва «акадэмізаваных» народнікаў выклікаць не было здольна.

На Беларусі ў 60-70-я гг. ў музычнае мастацтвазнаўства прыйшлі маладыя навукоўцы, звязаныя з Ленінградскай школай кампазітара Барыса Асаф'ева – інтэлектуальныя спадкаемцы Яўгена Гіпіўса і Зінаіды Эвальд, якія ў свой час шмат зрабілі для беларускай этнамузыкалогіі (манаграфія «Песні Беларускага Палесся», артыкул «Сацыяльнае пераасмысленне жніўных песень Беларускага Палесся» З.Эвальд). Моладзь вызначылася не толькі ўдалымі навуковымі выданнямі і паспяховымі даследчымі экспедыцыямі, але ж і арганізацыяй этнаграфічных канцэртаў у Саюзе пісьменнікаў Беларусі, калі на сталічную сцэну трапілі вясковыя спевакі, што зрабілі сапраўдны «этнафанічны прарыў» у гукавой прасторы Мінска. З гэтымі падзеямі

* Метад уключанага назіраня ў культурнай антрапалогіі мае на ўвазе непасрэдны кантакт з носьбітамі культуры, якую вывучаюць. Даследчыкі пэўны час павінны пражыць ва ўмовах людзей, якія з'яўляюцца аб'ектам іх даследванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знітаваны пачатак дзейнасці Зінаіды Мажэйка, якая паспяхова працягваецца дагэтуль.

У 80-я гады Ансамбль Дзмітрыя Пакроўскага неаднаразова гастраляваў на Беларусі і нават рабіў экспедыцыйныя запісы. На канцэрты трапляла шмат гуманітарна адукаванай моладзі. Гэта стала моцным штуршком для творчага пошуку, звяртання мінскімі маладымі гуманітарыямі да беларускай аўтэнтычнай традыцыі. Прадстаўнікі гэтай генерацыі шмат у чым вызначылі карціну развіцця фальклорнага руху і творчага жыцця сталіцы Беларусі ў 80-90-я гг. ХХ ст. Да яе належаць: Ларыса Сімаковіч (двайная кансерваторская адукацыя: па класу харавога дырыжыравання і па класу кампазіцыі; кіраўніцтва гуртом «Дзяньніца» і фолк-тэатрам «Госьціца»); Валянціна Гладкая (выпускніца народнай харавой кафедры Мінскаа інстытута культуры – МІК*; гурт «Неруш» БДУ); Іван Кірчук (МІК, аспірантура ІМЭФ**; фальклорны гурт «Дзіва», гурт «Троіца»), Маргарыта Іванова (харавая адукацыя ў кансерваторыі; першы дзіцячы “народны” беларускі калектыў – “Зорачка”).

### *Тэма 11.* Тэхналагічная замена ўключанага назірання

Пытанні:

1. Магчымасці аўдыё- і відэатэхнікі ў навучанні: «за» і «супраць».
2. Фолькклуб «Маладзёвы». Гурты «Калыханка», «Куманёк» Ларысы Рыжковай, «Берагіня» Мётчанскай СШ Барысаўскага раёна.

Літаратура:

1. Белорусская этномузыкологлгия: очерки истории (XIX – XXвв.) / ред. З. Можейко. – Минск: Тэхналогія, 1997. – 248 с.: нот.

---

* МІК – Мінскі інстытут культуры. З 199… – Беларускі універсітэт культуры, з 2000 – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры.

** ІМЭФ – Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору пры АН Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

3. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

4. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

З-за шэрагу фінансавых і культурных абмежаванняў рэгулярна ўжываць на практыцы ўключанае назіранне немагчыма. Часам фізічны кантакт імкнуцца замяніць на віртуальны – тэхнагенны.

Еўрапейскі фальклор, што фіксавалі даследчыкі ў XIX-XX стст. шчыльна знітаваны з *вясковым* ладам жыцця, прамысловымі і земляробчымі гаспадарчымі цыкламі. Па меры развіцця заходняй цывілізацыі ўсё большая частка насельніцтва *ўрбанізуецца* – перабіраецца ў вялікія гарады. Знікае сам лад жыцця, які забяспечваў трансляцыю традыцыі як цэласнай з'явы скрозь час. Напачатку XXI паміраюць амаль апошнія носьбіты традыцыі, іх усё складаней адшукаць для вуснай перадачы.

Шмат у якіх краінах узоры этнічнай традыцыі захоўваюцца мэтанакіравана і надзейна: створаны спецыяльныя архівы і сховішча, у якіх відэа- і аўдыёзапісы пільнуюць у пэўным тэмпературным і інш. рэжымах, якія забяспечваюць іх добрую захаванасць. З 80-90-х гг запісы пачалі актыўна пераводзіць на лічбавыя носьбіты, якія гіпатэтычна могуць захоўвацца вельмі доўга. Такім чынам існуе банк дадзеных, які даволі падрабязна адлюстроўвае фальклорныя ўзоры, дае магчымасць азнаёміцца з традыцыяй без непасрэднага «фізіялагічнага» кантакта з яе носьбітамі.

Тэхніка забяспечвае перадачу інфармацыі ад носьбіта-*адрасанта* (таго, хто з'яўляецца крыніцай інфармацыі, навучае) да даследчыка-*адрасата* (таго,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хто прыймае паведамленне, навучаецца). Такім чынам здольна адбыцца *тэхналагічная замена ўключанага назірання*.

Як усякая з'ява рэчаіснасці, яна мае *станоўчыя і адмоўныя* бакі. Станоўчыя: для азнаямлення з матэрыялам магчыма сколькі трэба разоў праслухаць, прагледзець запіс, звярнуца да яго ў любы зручны для даследчыка час. Адмоўныя: любая фіксацыя мае пэўныя межы, якія не дазваляюць азнаёміцца з прадметам так, як пры асабістым кантакце. Сам па сабе аўдыа-, альбо відэазапіс традыцыйных выканаўцаў дае не так і шмат інфармацыі. Калі ім карыстаецца чалавек, які яго не рабіў, па-за межамі яго ўвагі часцяком застаецца кантэкст існавання культурных з'яў, што там зафіксаваны. Часцяком невядома, ў якіх *сезонных* (пара году, святочная прымеркаванасць); *часовых* (час сутак, прыдатны для выканання); *асабістых* (у якой частцы сямейнага абраду, які павінны быць сацыяльны стан выканаўца: сямейнае становішча, ўзрост, ступень сваяцтва да таго, каму дапасуецца выкананне); *рэгіянальных* (з'яўляецца выканаўца мясцовым тубыльцам ці мігрантам) *умовах* рэлевантна зафіксаваная культурная з'ява. Небяспеку выпадання з кантэксту мела на ўвазе Зінаіда Мажэйка, калі крытыкавала перакананні, згодна якім фальклорам здольны займацца які заўгодна чалавек, што мае магнітафон. Не гледзячы на ўласна "фізічныя" адмоўныя бакі (толькі той ракурс відэазапісу, які абраў аператар; толькі тыя куплеты песень, што палічыў мэтазгодным зафіксаваць этнамузыколаг і г. д.) азнаямленне з традыцыяй толькі з дапамогай тэхнагенных сродкаў часцяком цалкам не здольна адлюстраваць невербальныя, псіхалагічныя асаблівасці існавання традыцыі. Менавіта тое, што ўздзейнічае на падсвядомасць людзей, якія да яе далучаюцца.

З гэтым прыходзіцца сутыкацца тым, хто практыкуе развучванне традыцыйных спеваў і танцаў з аўдыё- і відэазапісаў. Пры такім падыходзе да навучання шмат што залежыць ад асобы чалавека, што гэта арганізуе: педагога, выхаваццеля. Ад яго адукаванасці, агульнай культуры, харызмы і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Большасць з дзеячоў фальклорнага руху, што пачыналі ў 80-х гадах паступова сталі прафесіянальнымі дзеячамі мастацтва. Яны звярнуліся да творчага пошуку, пошуку самавыяўлення праз сінтэз жанраў (фальклор і поп-музыка – Іван Кірчук; фальклор і сучасная харэаграфія і тэатр – Ларыса Сімаковіч; фальклор і клубная самадзейнасць – Валянціна Гладкая), што канцэптуальна, эстэтычна адводзіла іх ад рафінаваных узораў традыцыі.

У 90-я гг., у сувязі з тагачасовай хваляй беларусізацыі распачалася дзейнасць шэрагу асоб, што падыходзілі да фальклору строга культурна-антрапалагічна. Яны бывалі ў экспедыцыях і вывучалі фальклор метадам уключанага назірання, як і іх папярэднікі. Але ж у адрозненні ад апошніх, яны абралі мэтай: не "стаяць" паміж традыцыяй і сваімі вучнямі; не быць адзіным "медыумам", які забяспечвае далучэнне да фальклору; а забяспечыць кантакт "традыцыя – неафіт" "напрамкі", з мінімальным асабіста-педагагічным уплывам.

Мала хто з гледачоў фестывалю "Славянскі базар-2000" ведаў, што ўсе вакалісткі рок-гурта "Юр'я" – вучаніцы Ларысы Мікалаеўны Рыжковай, кіраўніка дзіцячага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Калыханка" в.Міханавічы Мінскага раёна. Рэжысёр па адукацыі, яна здоляла з дапамогай камбініравання: навучання з аўдыёзапісаў і ўключанага назірання навучыць сваіх выхаванцаў спяваць з захаваннем спеўнай манеры і прыёмаў інтанавання, характэрных традыцыйным выканаўцам. Яе малодшыя выхаванцы – гурт "Куманёк" удзельнічаў у спектаклях, якія ладзіў рок-спявак Вячаслаў Бутусаў і тэатральны гурт "Ліцэдзеі".

Надзвычай дакладна захавана пластыка і лексіка традыцыйнага бытавога танца, арганічнае спалучэнне танцу і прыпевак ў выкананні фальклорна-этнаграфічнага гурта "Берагіня" Мётчанскай СШ Барысаўскага раёна (кіраўнік – Мікола Аляксеевіч Козенка). Аснова рэпертуару гурта – традыцыйны бытавы танец барысаўшчыны. Згодна канцэптуальнага падыходу кіраўніка, дзеці пераймаюць танцы непасрэдна ад носьбітаў ("з нагі на нагу"), альбо з плёнак вялікага відэаархіву Міколы Аляксеевіча. Яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучні робяць упэўненыя крокі па шляху авалодання мясцовай спеўнай манерай пад кіраўніцтвам завуча школы Антаніны Абрамовіч.

Меньш шырока вядомых, але таксама важкіх вынікаў дасягнула ў навучанні беларускім спевам лідэр фольkклуба “Маладзёвы” пры Беларускай мастацкай акадэміі Ірына Мазюк. Студэнты-мастакі, з якімі яна займаецца, добра арыентуюцца ў традыцыйнай спеўнай манеры, інтанаванні, засвоілі шмат тэхнік: ад манадыйных паазерскіх спеваў да палескай падводкі. У гэтым ім дапамаглі запісы з калекцыі Ірыны, якія яна рабіла ў час асабістых экспедыцый, альбо атрымала ад старэйшых фальклрыстаў – Тамары Варфаламеевай, Міколы Козенка, Рэгіны Гамзовіч.

## *Тэма 12.* Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаўу Беларусі

Пытанні:

1. Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў выхавання (аматары, этнакультурнае выхаванне).
2. Спецыфіка дзяржаўных установу адукацыі (музычная школа – вучэльня мастацтваў – універсітэт культуры).

Літаратура:

1. Емельянов, В.В. Развнтие голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

2. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 8 с.

3. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

5. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

6. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

7. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

8. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

9. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

10. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

Згодна агульнапрынятаму вызначэнню, а д у к а ц ы я *– набыццё асобай грамадска карысных ведаў, уменняў і навыкаў.* Як бачым, гэта пакрывае значна большую плашчыню, чым набыццё пісьменнасці: навыкаў лічэння, правапісу, працы на кап’ютэры. Пры сацыякультурна-антрапалогічным падыходзе да вывучэння грамадства выкрэсліваюць а д у к а ц ы ю *нефармальную* і *фармальную*.

З нефармальнай адукацыяй дзіцёнак сутыкаецца ў сямьі і працягвае яе: ў асяродках сяброў па адпачынку і захапленням; у розных пазашкольных установах; увогуле ў працэсе штодзённых зносінаў з соцыумам. Асноўная прыкмета адукацыі нефармальнай – адсутнасьць спецыяльна арганізаванага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальнага працэсу. Каля 90% сваіх грамадска карысных ведаў (як зносіцца з людзьмі і навакольлем; як ставіцца да сваякоў і суседзяў; як сябе паводзіць у зосінах з супрацьлеглым полам, з тым, хто больш сільны, ці больш слабы; як шукаць дах над галавой, ежу і г.д.) мы набываем у працэсе дадатковай адукацыі.

Месца сустрэчы з адукацыяй фармальнай – навучальная ўстанова. Яе «вуытворцы» – прафесійныя настаўнікі, выкладчыкі мэтанакіравана ў сістэме спецыяльна арганізаваных  урокаў, лекцый, семінараў знаёмяць сваіх вучняў і студэнтаў з ведамі, ўменнямі і навыкамі, якія спатрэбяцца апошнім у будучым – дарослым жыцці раўнапраўных членаў грамадства.

Ва ўстановах нефармальнай, альбо як яшчэ іх завуць “дадатковай” адукацыі, альбо “выхаваўчых” установах Беларусі (Цэнтрах пазашкольнай працы, Цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі, разнастайных грамадскіх аб’яднаннях – Асацыяцыі клубаў ЮНЭСКА, скаўцкіх і валонцерскіх суполках) на паперы народнай культуры надаецца пэўнае значэнне. Кожная такая установа звычайна мае разнастайныя мастацкія калектывы, што займаюцца народнай творчасцю. З’яўляцца такія гурткі і ансамблі на Беларусі пачалі ў 70-80-х гг. Большасць з іх былі спадкаемцамі піянерскіх ансамбляў песні і пляскі, таму а ніякай этнафаноніі і рэгіянальнасці, этнакультурным выхаванні гаворка ў тыя часы не ішла. Арыентырам для іх кіраўнікоў былі акадэмізаваныя ўзоры савецкага мастацтва, якія яны набывалі ў час адукацыі ў музычных, культасветвучэльнях, кансерваторыях і інстытутах культуры.

Апошнія таксама трымалі курс на тое, што ў тыя часы лічылі “прафесіянальным”: бегласць пальцаў, вышыю падскокаў і плісюдаў, “летуценнасць” кантыленных спеваў і г.д. Асаблівасці этнічнага мастацтва браліся да ўвагі мінімальна. Іх розным шляхамі апрацоўвалі, стылізавалі, “дацягвалі да прафесійнага ўзроўню”. Між тым, нават з пункту гледжання нават нарматыўных дакументаў сістэм адукацыі і выхавання такі падыход нельга лічыць прафесійным і адэкватным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка працы адзінкі этнакультурнага выхавання – фальклорнага ансамбля ва ўмовах дзяржсістэмы адукацыі і выхавання распрацавана яшчэ ў часы былога СССР. Такія тыпавыя дакументы як «Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ» і шматлікія больш сучасныя распрацоўкі *абавязкова* прадугледжваюць азнакамленне навучэнцаў з р э г і я н а л ь н а й спецыфікай фальклорных праяў. Гэта знаходзіць падтрымку і ў правілах удзелу ў рэгіянальных фальклорных фэстах у Расіі і Балтыі, дзе калектывы, што не адпавядаюць традыцыі сваёй мясцовасці, мікрарэгіёну* сёння, фактычна, не заўсёды маюць права выступаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Мікрарэгіён – «раён» як адміністрацыйная адзінка, населены пункт.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Вучэбныя выданні, афіцыныйна рэкамендаваныя МА РБ

1. Фалькларыстычны практыкум. Тыпавая вучэбная праграма па спецыяльнасях 1-21 05 01 Беларуская філалогія, 1-21 05 02 Руская філалогія, 1-21 05 04 Славянская філалогія // склад. І.В. Казакова, І.А. Швед. – Мінск : БДУ, 2008. – 34 с.

2. Працоўны сшытак па вуснай народнай творчасці. Тыпавая вучэбная праграма па спецыяльнасях 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць, 1-02 03 05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка // склад. В.А Вараб'ёва. – Мінск : БДПУ імя М.Танка, 2008. – 17 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ВМК

## 4.1 Пытанні да семінарскіх і практычных заняткаў

Практычныя заняткі 1.

*Спеўная манера. Гуказдабыванне.*

1. Маўленне як крыніца этнічных спеваў. Арфаэпіка мовы, яе ўплыў на асаблівасці этнічных спеваў. Натуральнасць і глыбіня розных дыялектаў беларускай мовы. Праслухоўванне аўдыязапісаў некаторых песень Беларускай Поўначы і Поўдня (Заходняга Палесся): аналіз маўлення і прапяванне.
2. Гуказдабыванне ў высокім рэгістры (ротаглотачнае рэзаніраванне) і ў сярэднім рэгістры (грудное рэзаніраванне). Праслухоўванне і спевы традыцыйных песень Веткаўшчыны і Беларускага Панямоння
3. Розныя прыёмы агласоўкі ў спевах. Праслухоўванне і аналіз аўдыязапісаў.

Практычныя заняткі 2.

*Спеўны стыль. Інтанаванне.*

1. Лінеарнасць як аснова музычнага стылю мыслення ў фальклоры беларусаў. Прынцыповая манодыя (і гетэрафонія як разнавіднасць манодыі) раннетрадыцыйнай класікі беларускіх песень. Праслухоўванне каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых традыцыйных песень, аналіз тыпаў музычнага мыслення.
2. Разгорнутая мелізматыка, «гнуткасць» голасавядзення мелодый народных песень. Праслухоўванне і аналіз дапаведных песень.
3. Слыхавы аналіз і прапяванне ўзораў песень манадыйнай фактуры (у т.л. і розных тыпаў гетэрафоніі) і шматгалосся (спевы з падводкай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практычныя заняткі 3.

*Этнафанічны сінкрэтызм:*

*элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніі ў спевах*

1. Раннетрадыцыйны фальклор як узор сінкрэтызму народнага мастацтва. Рытуальная харэаграфія і яе пазнейшыя пераасэнсаваныя гульнёвыя формы: карагоды, гульні; традыцыйна-побытавы танец. Прагляд урыўкаў фальклорна-этнаграфічных фільмаў З. Мажэйкі, Р. Гамзовіч, Т. Кухаронак і некаторых відэазапісаў з калекцыі кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ з мэтай аналізу беларускай этнахарэаграфіі.

2. Акампанемент, скрыпка і дуда — традыцыйныя інструменты беларусаў у крыніцах этнографаў XIX — першай паловы XX ст. Прагляд урыўкаў фальклорна-этнаграфічных фільмаў З. Мажэйкі, праслухоўванне аўдыязапісаў узораў традыцыйнай інструментальнай музыкі.

Практычныя заняткі 4.

*Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці.*

1. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Паазер'е і Панямонне. Праслухоўванне традыцыйных песень з паўночна-ўсходнімі дыялектамі беларускіх гаворак.

2. Манодыя як аснова мясцовага меласу. Праслухоўванне і аналіз мелізматыкі мелодыцы паўночных песень Беларусі. Прапяванне 2-3-х узораў такіх песень.

3. Пачатковая поліфанія: антыфоны, каноны каляндарных і сямейна-абрадавых песень; кантрастна-лінеарнае шматгалоссе, абрад «барана». Праслухоўванне і практычнае ўвасабленне студэнтамі антыфонных спеваў купальскіх песень Віцебскага Паддзвіння.

Практычныя заняткі 5.

*Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Усходняе і Заходняе Палессе. Паўднёва-заходні дыялект, палеская група гаворак. Аналіз на слых дыялектаў заходнепалескіх і ўсходнепалескіх песень.
2. Характэрныя тыпы гетэрафоніі гуртавога выканання на Палессі (гетэрафонія на бурдоннай аснове і т.зв. гетэрафонія тыпу “рознагалосся”): праслухоўванне, аналіз, прапяванне некалькіх узораў песень.
3. Падгалосачна-паліфанічны тып інтанавання: спевы з падводкай. Слыхавы аналіз узораў песень, выкананне адной з іх.

Практычныя заняткі 6.

*Уключанае назіранне і этнафонія.*

1. «Фалькларысты, якія спяваюць». Праслухоўванне музыкі ансамбля Дзмітрыя Пакроўскага, беларускіх гуртоў “Палац”, “Тройца”, “Юр’я”, “Ветах”, “Ліцвіны”, інструментальнай капэлы “На таку”. Аналіз-гутарка музычных стыляў, у якіх працуюць сучасныя калектвы беларускай музыкі.
2. Культурна-антрапалагічны метад уключанага назірання як неабходная ўмова пераемнасці спеўных традыцый.

Практычныя заняткі 7.

*Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаўу Беларусі*

1. Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў выхавання: *аматары, «этнакультурнае выхаванне»* ва ўстановах дадатковай адукацыі і шляхам мастацкай адукацыі - *харавікоў і вакалістаў-народнікаў* (сістэма «музычная школа - вучылішча мастацтваў - універсітэт культуры»).
2. Рэспубліканскі праект «Танцавальны фальклор і дзеці», тыпавыя навучальныя праграмы «Фальклорны ансамбль», «Музычны фальклор», «Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі». Азнаямленне студэнтаў з праграмамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Інфармацыйна-метадычная частка:

## Аўдыёграфія

**Грамдыскі:**

1. Белорусские народные песни: Этнографический ансамбль села Ананьчицы Солигорского района Минской области / Сост. Л.Костюковец. М., “Мелодия”, 1982.
2. Белорусский песенный фольклор / Сост. З. Можейко, И. Назина, Т. Варфоломеева. Экспед. записи Фольклорной комиссии СК Белоруссии 1960-1980 гг. М., “Мелодия”, 1990. 2 грп. (Серия “Музыкальное творчество народов СССР: Антология”).
3. Белорусский песенный фольклор: Северо-восточная зона / Сост. З. Можейко. М., “Мелодия”, 1986.
4. Календарные песни Белорусского Полесья: Из собрания Фонограмархива Пушкинского Дома / Сост. Ю.Марченко. М., “Мелодия”, 1983.
5. Напевы родины Мусоргского / Сост. А.Мехнецов, Г.Лобкова. М., “Мелодия”, 1987.
6. Народные песни и наигрыши Псковской области: По материалам фольклорных экспедиций Н.Л.Котиковой / Сост. А.Ю.Кастров. М., “Мелодия”, 1989.
7. Песни Смоленского Поднепровья: Из собрания Фонограмархива Пушкинского дома / Аннотация С.В.Фролова. М., “Мелодия”, 1989.
8. Русская народная музыка западных, центральных областей и Поволжья / Сост. Н. Савельева, Н.Гилярова. М., “Мелодия”, 1990. 2 грп. (Серия “Музыкальное творчество народов СССР: Антология”).
9. Традиционное искусство Поозерья: Обрядовая музыка / Сост. А.Ромодин, И.Ромодина. М., “Мелодия”, 1989.
10. Традиционное искусство Поозерья: Вечериночная музыка / Сост. А.Ромодин, И.Ромодина. М., “Мелодия”, 1990.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Традиционные песни Полесья: Из собрания Фонограммархива Пушкинского Дома / Сост. Л. Петрова, Ю. Марченко. М., “Мелодия”, 1989.
12. Усвятские песни: Поёт народная исполнительница Ольга Сергеева / Аннотация Е.Н.Разумовской. М., “Мелодия”, б.г.

**CD –дыскі:**

13. Аўтэнтычная музыка Беларусі: Каляды. Часткі I, II [Электронны рэсурс] / склад. Ю. Выдронак. – Мінск: Беларуская музычная альтэрнатыва, 2000.
14. Музычныя традыцыі Масленіцы Беларускага Падняпроўя [Электронны рэсурс] / склад. В.М. Прыбылова. – Электрон. дадз. (48’23’’ гуч.). – Мінск: УА “Беларус. дзярж. акад. музыкі”, 2006. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет (12 с.).
15. Народныя песні Беларускага Панямоння [Электронны рэсурс] / склад. Т. Б. Варфаламеева – Мінск: УА “Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры”, 1992. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет.
16. Народныя песні Цэнтральнай Беларусі [Электронны рэсурс] / склад. Т. Б. Варфаламеева – Мінск: УА “Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры”, 1992. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет.
17. Століншчына: Экспедыцыя Івана Кірчука ў Столінскі раён Брэсцкай вобласці [Электронны рэсурс] / склад. І.Кірчук – Мінск: - Беларуская музычная альтэрнатыва, 2005
18. Этнічная музыка беларусаў: у 5 дысках [Электронны рэсурс] / кір. праекта А.М.Боганева, уклад. І.В.Мазюк. – Мінск: УА “Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, 2006. – 5 электрон. апт. дыскаў (CD-ROM): гуч., буклет.

**Кіна- , відэаграфія**

1. Голоса веков / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1979.
2. Память столетий / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1982.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Пранясі, Божа, хмару / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1990.
4. Рух зямлі / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1999.
5. Мужчынскі рой / Сцэн. Г. Тавлай, рэж. С. Гайдук - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.
6. Мотальскія байкі / Сцэн. і рэж. В. Пястоў - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1990.
7. Карагод / Сцэн. Н. Козенка, рэж. і апер. О. Шклярэўскі - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.
8. Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
9. Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1996.
10. Вяселле ў Мотալі. Абрад “свахі” / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
11. Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1999.
12. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1997.
13. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
14. Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Заданні для кантралюемай самастойнай работы

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па агульным напрамку «Рэгіянальныя асаблівасці абрадавай, спеўнай, інстументальнай і танцавальнай традыцый Беларусі» па адной з тэмаў, якія прыведзеныя ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсу.

### Формы выканання самастойнай работы:

- Напісанне ЭССЭ на тэму этнафоніі гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў.
- Напісанне рэферату (не менш 12 старонак);
- Распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);
- Распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі)
- Пашпартызацыя і сістэматызацыя фальклорных узораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 Пытанні да заліку

1. Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны.
2. Месца спеўнай этнафоніі ў фарміраванні этнічнай культуры.
3. Сувязь этнафоназнаўства з іншымі адгалінаваннямі этнаграфіі і практычнай фалькларыстыкі.
4. Асноўныя паняцці: народнасць, этнас, гук, народная культура, этнічная музыка.
5. Камунікацыя як складальнік культуры. Традыцыйная камунікацыя: адрасаты і адрасанты.
6. Каляндарная, працоўная, сямейна-абрадавая спеўная культура як рэшткі тэафаніі.
7. Ядро этнічнай спеўнай культуры. Падставы формульнасці і сістэмнасці этнафоніі.
8. Сэнс дзейнасці спецыялістаў-захаванннльнікаў у галіне традыцыйнай культуры. Камунікацыйныя мэты, інтэнцыі і перспектывы. Прававая база.
9. Месца традыцыйнай культуры ў галінах дзяржаўных інстытутаў культуры і адукацыі.
10. Спеўная манера: гуказдабыванне. Мова.Арфаэпіка.
11. Спеўная манера: гуказдабыванне. Натуральнасць і глыбіня. Грудныя рэзанатары.
12. Спеўны стыль: інтанаванне. Лінеарнасць. Манодыя.
13. Спеўны стыль: інтанаванне. Пачатковыя элементы шматгалосся, паліфоніі, кантрастна-лінеарнае шматгалоссе.
14. Інтанацыя: праходная інтэрваліка, унісоны.
15. Раннетрадыцыйны фальклор як узор сінкрэтызму народнага мастацтва.
16. Рытуальная харэаграфія і яе пазнейшыя пераасэнсаваныя гульнёвыя формы: карагоды, гульні; традыцыйна-побытавы танец.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Акампанемент, скрыпка і дуда — традыцыйныя інструменты беларусаў у крыніцах этнографаў XIX — першай паловы XX ст.
18. Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Віцебскага Паддзвіння і Гродзенскага Панямоння.
19. Усходняе і Заходняе Палессе. Этнафанічныя асаблівасці.
20. Магілёўскае і Гомельскае Падняпроўе. Этнафанічныя асаблівасці.
21. Цэнтральная Беларусь. Сінтэтычнасць спеўнай сістэмы.
22. Культурна-антрапалагічны метад уключанага назірання.
23. «Вакальная рэвалюцыя» Дзмітрыя Пакроўскага. Дзейнасць беларускіх этнамузыколагаў.
24. Магчымасці аўдыё- і відэатэхнікі ў навучанні этнафоніі рэгіёнаў: «за» і «супраць».
25. Сучасныя дзіцячыя і маладзёвыя постфальклорныя гурты.
26. Вопыт засваення беларускай этнафоніі ва ўмовах урбанізацыі.
27. Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў выхавання і ўстаноў адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Пытанні да экзамена

1. Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны.
2. Месца спеўнай этнафоніі ў фарміраванні этнічнай культуры.
3. Сувязь этнафоназнаўства з іншымі адгалінаваннямі этнаграфіі і практычнай фальклярыстыкі.
4. Асноўныя паняцці: народнасць, этнас, гук, народная культура, этнічная музыка.
5. Камунікацыя як складальнік культуры.
6. Традыцыйная камунікацыя: адрасаты і адрасанты.
7. Каляндарная, працоўная, сямейна-абрадавая спеўная культура як рэшткі тэафаніі.
8. Ядро этнічнай спеўнай культуры.
9. Падставы формульнасці і сістэмнасці этнафоніі.
10. Сэнс дзейнасці спецыялістаў-захавальнікаў у галіне традыцыйнай мастацкай культуры.
11. Месца традыцыйнай культуры ў галінах дзяржаўных інстытутаў культуры і адукацыі.
12. Спеўная манера: гуказдабыванне. Мова.Арфаэпіка.
13. Спеўная манера: гуказдабыванне. Натуральнасць і глыбіня. Грудныя рэзанатары.
14. Спеўны стыль: інтанаванне. Лінеарнасць. Манодыя.
15. Спеўны стыль: інтанаванне. Пачатковыя элементы шматгалосся, паліфоніі, кантрастна-лінеарнае шматгалоссе.
16. Інтанацыя: праходная інтэрваліка, унісоны.
17. Раннетрадыцыйны фальклор як узор сінкрэтызму народнага мастацтва.
18. Рытуальная харэаграфія і яе пазнейшыя пераасэнсаваныя гульнёвыя формы: карагоды, гульні; традыцыйна-побытавы танец.
19. Акампанемент, скрыпка і дуда — традыцыйныя інструменты беларусаў у крыніцах этнографаў XIX — першай паловы XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Віцебскага Паддзвіння і Гродзенскага Панямоння.
21. Кантрастная паліфонія: антыфон, канон; кантрастна-лінеарнае шматгалоссе: абрад «Барана».
22. Усходняе і Заходняе Палессе. Этнафанічныя асаблівасці. Тыпы гетэрафоніі.
23. Усходняе і Заходняе Палессе. Этнафанічныя асаблівасці. Тыпы палескага шмагалосся.
24. Магілёўскае і Гомельскае Падняпроўе. Этнафанічныя асаблівасці.
25. Характэрныя тыпы гетэрафоніі. Спевы “з падцягам”.
26. Цэнтральная Беларусь. Сінтэтычнасць спеўнай сістэмы.
27. Культурна-антрапалагічны метад уключанага назірання.
28. «Вакальная рэвалюцыя» Дзмітрыя Пакроўскага. Дзейнасць беларускіх этнамузыколагаў.
29. Магчымасці аўдыё- і відэатэхнікі ў навучанні этнафоніі рэгіёнаў: «за» і «супраць».
30. Сучасныя дзіцячыя і маладзёвыя постфальклорныя гурты.
31. Вопыт засваення беларускай этнафоніі ва ўмовах урбанізацыі.
32. Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў выхавання (аматары, этнакультурнае выхаванне).
33. Спецыфіка дзяржаўных устаноў адукацыі (музычная школа – вучэльня мастацтваў – універсітэт культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 4.5 Пытанні да выніковай атэстацыі

1. Беларуская этнафонія ў рэчышчы культурнай антрапалогіі.
2. Культура і традыцыя ў культурнай антрапалогіі.
3. Беларуская спеўная традыцыя: погляд антраполага.
4. Умовы дзейнасці спецыялістау - захавальнікаў традыцыі ў Беларусі.
5. Спеўная манера: гуказдабыванне.
6. Спеўны стыль: інтанаванне.
7. Этнафанічны сінкрэтызм: элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніііў спевах.
8. Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці.
9. Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці.
10. Усход Беларусі і Цэнтральная Беларусь: этнафанічныя асаблівасці.
11. Уключанае назіранне і этнафонія.
12. Тэхналагічная замена ўключанага назірання.
13. Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаў у Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.6 Тэматыка рэфератаў, курсавых і дыпломных работ

Для напісання рэфератаў студэнты могуць абраць любую тэму з курса лекцый. Пры выбары тэмы курсавых і дыпломных работ пажадана выбіраць тэмы, якія бы асвятлялі асаблівасці этнафанічнай традыцыі пэўнага рэгіёну (напрыклад, “Этнафонія карагодаў Гомельскага Паднярпроўя”) ці мікрарэгіёну (напрыклад, “Этнафонія абрадавых песень в.Клятная Пінскага раёна Брэсцкай вобласці”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.7 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Ацэнка і вызначэнне ўзроўню ведаў і прафесійных кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца з дапамогай 10-бальнай шкалы: 10 (дзесяць), 9 (дзевяць), 8 (восем), 7 (сем), 6 (шэсць), 5 (пяць), 4 (чатыры), 3 (тры), 2 (два), 1 (адзін). Дастатковы ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў ацэньваецца адзнакай, не меншай за 4 (чатыры) балы. Балы 1 (адзін), 2 (два), 3 (тры) з'яўляюцца нездавальняючай ацэнкай і недастатковай для далейшага працягу навучання, яны не забяспечваюць дастатковы аб'ём ведаў і кампетэнцый у межах адукацыйнага стандарта. Балы 1 (адзін), 2 (два), 3 (тры) не выстаўляюцца ў заліковую кніжку, толькі ў экзаменацыйную ведамасць.

Пры распрацоўцы наступных крытэрыяў ацэнкі выкарастаны тыпавыя крытэрыі вынікаў вучэбнай дзейнасці, распрацаваныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікік Беларусь.

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення фальклору). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля адукацыи щ ВНУ), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблем адукацыі ў ВНУ, фармуліроўка высноў. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі.<br>Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльна-карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі культуры, праблемах і тэндэнцыях этнамастацкай адукацыі. |

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

- падрыхтоўка прэзентацый;
- падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
- напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
- вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне, вучэбная праграма УВА па вучэбнай дысцыпліне

1. Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію. Вучэбная праграма для ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) // Укладальнікі Э. В. Шчадрына, Т. А. Пладунова. – Мінск: БДУКМ, 2022. – 16.с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Рабочы тэматычны план па дысцыпліне

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Лекцыйныя заняткі | Семінарскія заняткі | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Уводзіны** | | | | |
| | **Раздзел I.** Беларуская этнафонія ў рэчышчы культурнай антрапалогіі | | | | |
| 2 | **Тэма 1.** Культура і традыцыя ў культурнай антрапалогіі | 2 | | | |
| 3 | **Тэма 2.** Беларуская спеўная традыцыя: погляд антраполага | 2 | | | |
| 4 | **Тэма 3.** Умовы дзейнасці спецыялістаў - захавальнікаў традыцыі ў Беларусі | 2 | | | |
| | **Раздзел II.** Складаючыя спеўнай этнафоніі | | | | |
| 5 | **Тэма 4.** Спеўная манера: гуказдабыванне | 4 | 2 | | |
| 6 | **Тэма 5.** Спеўны стыль: інтанаванне | 4 | | | |
| 7 | **Тэма 6.** Этнафанічны сінкрэтызм: элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніііў спевах | 4 | | | |
| | **Раздзел III.** Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне і этнафонія | | | | |
| 8 | **Тэма 7.** Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці | 4 | 4 | | |
| 9 | **Тэма 8.** Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці | 4 | 4 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 10 | **Тэма 9.** Усход Беларусі і Цэнтральная Беларусь: этнафанічныя асаблівасці | 4 | 4 | | |
| | **Раздзел** IV. Асновы методыкі ў этнафоніі | | | | |
| 11 | **Тэма 10.** Уключанае назіранне і этнафонія | 2 | | | |
| 12 | **Тэма 11.** Тэхналагічная замена ўключанага назірання | 2 | | | |
| 13 | **Тэма 12.** Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаў у Беларусі | 2 | | | |
| | **Усяго:** | **36** | **14** | | **экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 Методыкі выкладання дысцыпліны

У сучасных сацыяльна-культурных умовах значнае месца ў распаўсюджванні і папулярызацыі фальклору набывае аматарская мастацкая творчасць. Даследчыкі А.Ю. Аўчыннікава, Л.М. Лазарава, В.А. Лапін, Н.Р. Міхайлава, А.В. Несцярэнка, Т.К. Саладухіна і іншыя адзначаюць пашырэнне сацыяльнага складу аматараў фальклору сярод гарадскога насельніцтва. Узнікла шмат аматарскіх фальклорных калектываў, якія пераймаюць і транслююць народныя мастацкія традыцыі ў другасных, не аўтэнтычных, пераважна сцэнічных умовах. Гэта дае падставы гаварыць аб з'яўленні новага неаўтэнтычнага асяроддзя бытавання традыцыйнай спадчыны ў межах фальклрарызму.

Фальклрарызм – з'ява сучаснай мастацкай культуры, якая адлюстроўвае ўвесь спектр творчых інтэрпрэтацый фальклору. Тэрмін «фальклрарызм» быў уведзены ў навуковы зварот французскім фальклрарыстам XIX ст. П. Себіё для характарыстыкі другасных, неаўтэнтычных фальклорных з'яў (фальклор на сцэне, у аматарскай і прафесійнай творчасці і інш.). Шырокае распаўсюджванне ён атрымаў ў даследаваннях 60-х гг. XX ст., што тлумачыцца навуковым асэнсаваннем масавай міграцыі вясковага насельніцтва з уласцівай яму фальклорнай культурай у гарадское асяроддзе. Аднак навуковае вызначэнне тэрміна «фальклрарызм» не канчаткова выверанае і ўключае ў сябе шэраг супярэчнасцей. Гэта абумоўлена тым, што ён ахоплівае складаныя працэсы выкарыстання, адаптацыі і трансфармацыі традыцыйнага фальклору ў розных сферах сучаснай культуры. Асобныя даследчыкі (П.Г. Багатыроў, К.А. Багданаў, А.У. Захараў, Р.О. Якабсон і іншыя) пад фальклрарызмам разумеюць перш за ўсё яго негатыўныя праявы: псеўданародныя стылізацыі, празмерную мадэрнізацыю, якія вядуць да нівелявання нацыянальных вытокаў, камерцыялізацыі фальклору і г.д. Разам з тым існуе прынцыпова іншы падыход (А.М. Аляхновіч, В.Е. Гусеў, Э.К. Дарашэвіч, І.І. Зямцоўскі, Б.М. Пуцілаў і іншыя), накіраваны на разуменне і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ацэнку глыбіннай сутнасці фальклору, на захаванне яго каштоўнасцей у сучаснай сацыяльна-культурнай рэчаіснасці. Пры гэтым мерай каштоўнасці выступае першасная аўтэнтычная сутнасць фальклору.

Менавіта апошні падыход дае магчымасць вызначыць і асэнсаваць ступень ператварэння і трансфармацыі аўтэнтычнага фальклору ў творчай дзейнасці калектываў аматарскай творчасці, што патрабуе прынцыповай ацэнкі формаў засваення і выканальніцкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў.

І. М. Грамовіч, А. С. Кабанаў, Н. В. Калугіна, А. Ю. Любамудрава, Л. Л. Ражкова і іншыя вылучаюць чатыры тыпы выканальніцкай інтэрпрэтацыі, якія адлюстроўваюць сутнасць спасціжэння фальклорных твораў і, адпаведна, вызначаюць розныя формы арганізацыі калектываў аматарскай творчасці: 1) першасны традыцыйны спеў «этна-аўтэнтычных фальклорных груп» пры ўзнаўленні фальклорных узораў захоўвае стылявыя рысы і побытавую практыку іх функцыянавання праз удзел у святах і абрадах роднай мясцовасці; 2) дзейнасць «этнаграфічных фальклорных калектываў» адлюстроўвае рэпрадуктыўны спеў з захаваннем мясцовых (лакальных, рэгіянальных) асаблівасцей: яны рэпрэзентуюць традыцыйную спадчыну ў другасных, пераважна сцэнічных умовах; 3) выбарачнае стаўленне да традыцыйнага спеву, сінтэз фальклорнага і акадэмічнага пачатку ўласцівы творчай дзейнасці «народна-акадэмічных калектываў»; 4) для дзейнасці «фальклорна-сцэнічных калектываў» характэрна стылізацыя народна-песенных традыцый з арыентацыяй на ўніфікаваны ўзор, пры якім не захоўваецца мясцовая выканальніцкая спецыфіка.

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі адзначаныя формы арганізацыі аматарскіх фальклорных калектываў і прадстаўленыя імі тыпы выканальніцкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў рэдка існуюць у чыстым выглядзе. Яны спалучаюцца, канкурыруюць і часта дапаўняюць адзін аднаго, утвараючы даволі складаную, шматколерную палітру сучаснай культуры, адлюстроўваючы адначасова і яе багацце, і пашырэнне межаў, і беднасць, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страту першапачатковай цэласнасці ў залежнасці ад выбраных крытэрыяў ацэнкі.

З гэтых пазіцый неабходна звярнуць увагу на дзейнасць студэнцкіх фальклорных калектываў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, такіх як «Талака» (кіраўнікі Т. А. Пладунова, Э. В. Шчадрына, Ю. В. Люкевіч, А. У. Белы), «Этнасуполка» (кіраўнік Т. А. Пладунова), «Страла» (кіраўнік Э. В. Шчадрына), “Човэн” (кіраўнік Ю. В. Люкевіч), “Раме” (кіраўнік А. У. Белы). Асноўным накірункам творчасці гэтых калектываў з’яўляецца вывучэнне мясцовых, рэгіянальных традыцый увасаблення народных песень, гульняў, танцаў і карагодаў.

Першае на што звяртаюць увагу выкладчыкі – гэта ўсведамленне дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйна базай для ўзнікнення меладычнага багацця беларускай песеннасці. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме, з уласцівай яму інтанацыяй, становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцы студэнта.

Па-другое, гэта вывучэнне рэгіянальных музычна-стылявых заканамернасцей. Лакальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гуку, ладавыя асаблівасці, паліритмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда і інш), асаблівасці харэаграфіі і г. д. Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў розных вёсках, даюць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым кожны варыянт захоўвае сваю каштоўнасць і ўнікальнасць. Праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед студэнтаў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго ў выканальніцкай практыцы.

Надзвычай важна ўлічваць у рабоце студэнцкага фальклорнага калектыву варыятыўнасць выканання народнай песні, якая прадстаўляе сабой форму функцыянавання фальклорных узораў, іх імправізацыйнае пераўтварэнне, абумоўленае арыентацыяй на традыцыйны ўзор. Народныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстры спеваў кожны раз нанава выбудоўваюць музычную тканіну на аснове яго асноўнага напеву. Саліст-выканаўца можа дэманстраваць мноства розных варыянтаў асноўнага меладычнага контуру. У ансамблі галасы народных спевакоў свабодна пераплятаюцца паміж сабой, утвараючы кожны раз новае спалучэнне. Дзякуючы гэтаму, гучанне народнай песні пастаянна ўзбагачаецца, і гэтым яе выкананне носьбітамі традыцыі выгадна адрозніваецца ад завучаных па партыях спеваў, якія практыкуюцца ў многіх аматарскіх і прафесійных фальклорных калектывах.

Аднак, выкананне фальклорнага калектыву ні ў якім разе не павінна станавіцца толькі сляпым капіраваннем спеваў носьбітаў традыцыі. У многіх выпадках народныя выканаўцы пажылога ўзросту аказваюцца здольныя прайграць толькі меладычны контур напеву, без належнага тэмбравай-дынамічнага напаўнення. У такіх выпадках вялікую ўвагу варта звярнуць на словы саміх выканаўцаў, навуковыя публікацыі беларускіх этнамузыколагаў Т. Б. Варфаламеевай, З. Я. Мажэйка, Л. С. Мухарынскай, Т. С. Якіменка, В. М. Яшчанка і інш., якія могуць паведаміць пра тое, як на сам рэч павінна гучаць песня, пры якіх абставінах і г. д. Так, згодна з Л. С. Мухарынскай, характар гучання каляндарна-абрадавых песень, якія спяваюцца на вуліцы істотна адрозніваецца ад сямейна-абрадавых песень, якія спяваюцца ў хаце. Эмацыянальны пасыл, сіла «выкліка» у «загуканнях вясны», купальскіх, масленічных песнях дае магчымасць пры выкананні вызначыць неабходнасць спеваў ў больш высокай тэсітуры і з вялікай сілай гуку [1, с. 39].

У выкананні студэнцкага фальклорнага калектыву абрадавая песня можа прагучаць больш або меньш натуральна падчас рэканструкцыі абрадавай сітуацыі. Мэтазгодна выкарыстоўваць такія святы каляндарнага цыклу, як Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'я, Троіца, Купалле, Жніво, якія могуць набыць характар ўсеагульнага народнага гуляння. Так адбываецца паглыбленне студэнтаў у сферу абраду, а іх выкананне атрымлівае эмацыянальную афарбоўку, што забяспечвае неабходны характар гучання. Вясну «гукаюць спеўнымі купкамі «з гары на гару»; з велікоднымі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юраўскімі абыходнымі крокамі крочаць ад хаты да хаты; купальскія спяваюць уначы і па прызначэнню (як вянкі завіваюць, як абыходзяць жыта, як запальваюць вогнішча і водзяць карагоды, гуляюць і дражняцца адзін аднаго, як раніцай сустракаюць сонца)» [2, с. 106]. Шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульняў, танцаў і інш. разлічаны на свабоднае далучэнне ўсіх жадаючых, што дазваляе лёгка стварыць незабыўную атмасферу народнай эстэтыкі.

Відавочна, што аб дакладным засваенні і рэканструкцыі фальклорнай спадчыны можна гаварыць толькі ў тым выпадку, калі ўдзельнікі студэнцкага фальклорнага калектыву добра валодаюць песенным дыялектам – характарам вымаўлення тэксту, сістэмай пеўчай артыкуляцыі, свабодна выкарыстоўваюць падчас спеваў шматлікія элементы музычнай сістэмы лакальнага стылю, валодаюць тыпавымі для дадзенай традыцыі тэмбравымі характарыстыкамі гуку, якія ўзнікаюць у выніку каардынацыі індывідуальных асаблівасцяў голаса з гукавым узорам мясцовага вакальнага стылю.

Спіс літаратуры:

1. Мухаринская, Л. С. Белорусская народная песня : историческое развитие : очерки / Л. С. Мухаринская. – Минск : Наука и техника, 1977. – 216 с.

2. Пладунова, Т. А. Этнафанія стылі выканання і вакальная практыка ў аматарскім фальклорным калектыве / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання. В. 2. Матэрыялы III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (19 – 20 красавіка 2006 г., г.п. Акцябрскі) аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мн. : БелДІПК, 2006. – С. 101 – 108.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Метадычныя рэкамендацыі

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання, якія адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійнай кампетэнцыі студэнта, набыццю ведаў у галіне беларускага фальклору і фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, круглы стол, прэзентацыя, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў);

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка аўдыя- і відэаматэрыялаў);

– праблемныя (праблемнае выкладанне, пошукавы метад);

– кантрольна-ацэначныя метады.

Акрамя таго, на лекцыйных і практычных занятках павінны выкарыстоўвацца наступныя метады: непасрэдная дэманстрацыя фальклорных твораў ад носьбітаў і апасродкавая – з дапамогай гукааднаўляючай тэхнікі; развучванне песень з голасу выкладчыка ці з аўдыёносьбітаў; пераймáнне і дакладнае ўзнаўленне ўсіх асаблівасцей аўтэнтычнага выканання песні: правільнага гукавымання, фарміравання дыкцыйных, артыкуляцыйных, рытмічных, дынамічных асаблівасцей твору; аналіз твораў народнага мастацтва, які прадугледжвае выяўленне этнакультурных каштоўнасцей фальклору; супастаўленне мастацкіх вобразаў розных твораў народнага мастацтва паводле падабенства і адрознення іх функцыянальных, жанравых і рэгіянальных характарыстык; асацыятыўнае суаднясенне мастацкіх вобразаў з жыццёвай пазіцыяй студэнта.

Пажадана, каб на лекцыйных і практычных занятках выкарыстоўвалі запісы этнаграфічнай музыкі, апублікаваныя ў 80–90-я гг. ХХ ст. Ленінградскім філіялам студыі грамзапісу «Мелодия»: «Белорусский музыкальный фольклор: антология» (из серии «Музыкальное творчество

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народов СССР». Составление и аннотация З. Можейко, И. Назиной, Т. Варфоломеевой, 1990), «Белорусские народные песни: этнографический ансамбль села Ананчицы Солигорского района Минской области» (составление и аннотация Л. Костюковец, 1982; 2-е лазерное издание – 1988), «Календарные песни Белорусского Полесья. Из собрания Фонограммархива Пушкинского дома» (составление и аннотация Ю. Марченко, 1989), «Традиционные песни Полесья. Из собрания Фонограммархива Пушкинского дома» (составление и аннотация Л. Петрова, Ю. Марченко, 1989), «Белорусский песенный фольклор: северо-восточная зона» (составление и аннотация З. Можейко, 1986), «Традиционное искусство Поозерья: обрядовая музыка» (составление и аннотация А. Ромодина, И. Ромодиной, 1989).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.5Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны

### Асноўная літаратура:

1. Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. – Мінск : НЦТДІМ, 1998. – 54с.

2. Говард, Майкл. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард / Пер. с англ. І.Карпікавай, М.Раманоўскага, А.Шыманскага; Пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія; Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.

3. Емельянов, В.В. Развнтне голоса: Коорданацня и тренаж. / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 190 с.

4. Мельникова, Л.И. Детскнй музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учрежденнях (на примере земледельческих праздников) / Л.И Мельникова, А.Н. Зимина. — М.: Гном- Пресс; 2000. – 88с.

5. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко – Минск: Наука и техника; 1985. – 247 с.

6. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мінск: Выш. шк.; 1993. – 343 с.: іл.

7. Мядоцкі край і яго таленты: Даведнік фестывалю (30 мая - 1 чэрвеня 1997г., в. Мётча) / Укл. М.Козенка. – Мінск.; ВЛАДП-АРТ, 1997. – 109 с.

8. Назаренко, И.К. Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: Хрестоматия / И.К. Назаренко. – М.: Музыка; 1963. – 511 с.

9. Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: Праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 «народны хор» / Укл. І.Л.Сіневіч. – Мінск: БелІПК; 1999. – 24 с.

10. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия»; 1996. – 136с.

11. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь; 1996. – 208 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М.:Просвешение; 1986. – с.356-366.

**Дадатковая літаратура:**

1. Гульні, забавы, ігрышчы / Уклад. А.Лозка. - Мінск.: Беларуская навука; 1996. – 534с.: нот.іл.

2. Клюев, Е.В. Речевая коммуннкация: Учеб. пособие дая ун-тов и вузов / Е.В. Клюев. – М.: Изд-во «ПРИОР»; 1998. – 224 с.

3. Кодай, Золтан. Учебное пособне по сольфеджио / Золтан Кодай. – М.: Композитор; 1993. – 168 с.

4. Мыльныков, А.С. Язык культуры и вопросы изучения этнической специфики средств знаковой коммуникации/ А.С. Мыльныков // Этнографическое изученне знаковых средств культуры. – Л.: Наука; 1989. – с. 7-38.

5. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: Метод. пособие. – М.: ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

6. Хазова, М.В. Горенка: комплексное изученне музыкального фольклора / М.В. Хазова // Фольклор - музыка - театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / Под ред. С.И.Мерзляковой. – М., 1999. – 120 с.

**Кіна- , відэаграфія**

1. Голоса веков / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1979.

2. Память столетий / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1982.

3. Пранясі, Божа, хмару / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1990.

4. Рух зямлі / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Мужчынскі рой / Сцэн. Г. Тавлай, рэж. С. Гайдук - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.

6. Мотальскія байкі / Сцэн. і рэж. В. Пястоў - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1990.

7. Карагод / Сцэн. Н. Козенка, рэж. і апер. О. Шклярэўскі - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.

8. Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

9. Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1996.

10. Вяселле ў Моталі. Абрад “свахі” / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

11. Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1999.

12. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1997.

13. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

14. Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.6 Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы

1. Восточнославянский фольклор: словарь научной и народной терминологии / редакционная коллегия, Г.А. Барташевич, К.П. Кабашников (отв. редактор) – Мінск : Навука і тэхніка, 1993 г. – 478 ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ